Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІСТАПАД 5 1933 г. НЯДЗЕЛЯ № 245 (4789)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

УЧОРА АДКРЫЎСЯ ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЛЁТ УДАРНІКАЎ ЯКАСЦІ

Клуб імя Сталіна перапоўнен дэлегатамі. Лепшыя з лепшых рабочыя ўдарнікі з'ехаліся сюды, каб абмяняцца вопытам сваёй работы, падвесці вынікі работы прамысловасці БССР за 9 месяцаў г. г. і вызначыць мерапрыемствы для далейшай работы.

Пасля кароткай уступнай прамовы старшыня ЦСПСБ тав. Кавальчук адкрыў злёт. У прэзідыум злёта абраны сакратары ЦК КП(б)Б т. Гікало, Шаранговіч, Жэброўскі, Рыскін, старшыня СНК т. Галадзед, старшыня ЦВК БССР тав. Чарвякоў, старшыня ЦКК НК-РСІ тав. Лычоў, член рэспубліканскай камісіі па чыстцы Сахарава, сакратар ЦК ЛКСМБ т. Герцовіч, Картукоў, Пыжыкаў, Конік, Вайнер, Кудзелька, Амбражунас, Розін, Брагінскі, Хэйфец, Каган, Гурвіч, Досін, Касцевіч і інш.

Абраны ў ганаровы прэзідыум т. т. Сталін, Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Куйбышаў, Кіраў, Касіор, Орджанікідзэ, Андрэеў, Рудзутак, Любчыкаў, Гікало, Швэрнік, Тэльман, Анціпаў.

З вялікай увагай і цікавасцю дэлегаты злёта заслухалі першы даклад «Барацьба за якасць і аўладанне тэхнікай» — сакратара ЦК КП(б)Б тав. Рыскіна.

НЕ ЗДАЦЬ ПЯРШЫНСТВА

Мабілізацыя ўнутраных сродкаў на працягу ўсяго часу стаяла і стаіць у нас як адна з галоўных, першачарговых задач соцыялістычнага будаўніцтва.

Тав. СТАЛІН на XVI з'ездзе нашай партыі, акрэсліваючы шляхі соцыялістычнага наступлення па ўсяму фронту, мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў ставіў як адну з асноўных задач соцыялістычнага будаўніцтва. Ён гаварыў, што «сутнасць большэвіцкага наступлення заключаецца далей у тым, каб мабілізаваць максімум сродкаў на справу фінансавання нашай індустрыі, на справу фінансавання нашых калгасаў і саўгасаў».

Рабочыя, калгаснікі і працоўнае сялянства, пад непасрэдным кіраўніцтвам комуністычнай партыі, вырашаючы гістарычныя задачы пабудовы соцыялізма ў нашай краіне, на справе ажыццявілі ўказанні тав. Сталіна. Яны не толькі адда на затрачвалі свае сілы і энергію на грамадоўю гігантаў індустрыі — фабрык, заводаў, электрастанцый, чыгуначных і шасейных дарог, але ўкладвалі непасрэдна свае ўласныя вольныя грашовыя сродкі ў гэта будаўніцтва.

За першую пяцігодку толькі ад рэалізацыі пазык паступіла ў дзяржаўныя касы звыш 5,8 млрд. руб. На фінансаванне прамысловасці за гэты час выдаткавана звыш 24 млрд. руб. Паступленні ад пазык па сваёй суме складаюць каля адной чвэрткі ўсіх капіталаўкладанняў у соцыялістычную прамысловасць, а г. зн., што кожны чацвёрты гігант індустрыі будаваўся непасрэдна за кошт сродкаў ад рэалізацыі пазык, за кошт сродкаў самога працоўнага насельніцтва.

Велізарнейшы пласт нашых фінансавых мерапрыемстваў, і ў першую чаргу дзяржаўных пазык, вельмі выразна і пераканаўча растлумачыў у свой час рабочы-пенсіянер, які, пры падпісцы на пазыку другой пяцігодкі, заявіў:

— Я падпісваюся на пазыку таму, што мае аблігацыі заўсёды выігрываюць. Раней, да рэвалюцыі, пры царызме, мяне буржуі і паліцэйскія адусюль ганялі. Я пераходзіў з фабрыкі на фабрыку, пераязджаў з горада ў горад. Галадаў, жебраваў. Замест кватэры жыў у хляве. Зараз, пры совецкай уладзе, я атрымліваю пенсію па старасці год. Жыву ў добрай кватэры, якую мне дала совецкая ўлада. Два мае сыны скончылі вышэйшыя навуковыя ўстановы і зараз працуюць інжынерамі. Скажыце, што не выйгралі мае аблігацыі!

Зразумела, выйгралі, таксама, як выйгралі і аблігацыі ўсіх працоўных нашай краіны. Асноўны выйгрыш — гэта вынікі першай пяцігодкі, гэта закончаны фундамант соцыялізма. Праўда, нельга недаацэньваць і тых велізарнейшых непасрэдных асабістых выгад, якія пры носяць пазыкі і ўклады ў паасобку кожнаму працоўнаму.

Сакрачэнае і поўнае выкананне фінплана — ёсць адна з неабходнейшых умоў выканання плана соцыялістычнага будаўніцтва. «Без суровага выканання фінансавага плана,—адзначыў аб'яднаны снежаньскі пленум ЦК і ЦКК у сваёй пастанове, — немагчыма ажыццяўленне вызначаных гаспадарчых планаў па ўсіх галінах народнай гаспадаркі».

На працягу апошніх двух год БССР з квартала ў квартал ідзе ўперадзе па выкананні фінплана. У трэцім квартале БССР таксама заваявала пяршынства ў соцспаборніцтве з Заходняй вобласцю і заняла другое месца па выкананню плана сярод Саюзных рэспублік.

Гэтыя поспехі дасягнуты ў выніку шырока разгорнутай масавай работы, у выніку таго, што большасць раённых партыйных і совецкіх арганізацый непасрэдна кіравалі фінансавай работай у сельсоветах, што некаторыя партыйныя і комсамольскія ячэйкі ў сельсоветах, на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах фінансавую работу лічылі сваёй непасрэднай справай.

Уздым энтузіязма і энергіі працоўных, які быў у ТРЭЦІМ квартале, аднак, не скарыстан фінансавай сістэмай і не перанесен у практыку работы ЧАЦВЕРТАГА квартала. Раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі замест узмацнення масавай работы, замест разгортвання міжраённага спаборніцтва на датэрміновае выкананне фінплана і ўцягнення ў гэта спаборніцтва ўсіх сельсоветаў, калгасаў і саўгасаў, замест перанясення лепшых форм і метадаў работы ў адстаючыя раёны і сельсоветы зусім аслабілі фінансавую работу ў пачатку чацвертага квартала і тым самым паставілі пад яўную пагрозу выкананне фінансавага плана.

У трэцім квартале самым адсталым фінансавым участкам з'яўляліся добраахвотныя плацяжы. Першы месяц чацвертага квартала не даў належнага зруху на гэтым важнейшым участку фінансавай работы. Паступленні па пазыцы другой пяцігодкі, асабліва на вёсцы, на забяспечаны. Квартальны план па гэтаму плацяжу выкананы толькі на 24,2 проц. Па ўкладах у ашчадныя касы — на 2,3 проц. Пры выкананні агульнага плана мабілізацыі сродкаў па абавязковых плацяжах — на 44,3 проц.; добраахвотныя плацяжы выкананы толькі на 21,1 проц.

Асабліва нікуды не вартая работа ў чацвертым квартале наглядаецца па ЖЫТКАВІЦКАМУ, ЧАШНІЦКАМУ, УВАРАВІЦКАМУ і ЛЕЛЬЧЫЦКАМУ раёнах, па якіх планы добраахвотных плацяжоў не выкананы ні на адзін проц. Па раду раёнаў на гэту работу не звярачаецца ніякай увагі. Рэалізацыя пазыкі другой пяцігодкі сярод рабочых, калгаснікаў і аднаасобнікаў, не ахопленых у свой час падпіскай, зусім не праводзіцца. Вынікі рэалізацыі пазыкі, якія былі дасягнуты пры правядзенні кампаніі ў паасобных раёнах, не замацаваны.

Узяць хоць-бы ЖЛОБІНСКІ раён. У шмат якіх установах і прадпрыемствах раёна па падпісцы на пазыку да гэтага часу не паступіла ні аднаго рубля ўзносаў. Па саўгасу «Каменка» не ахоплена падпіскай на пазыку каля 100 рабочых.

З паступленнем грошай па падпісцы калгаснікаў дрэнна пастаўлена справа. Узносы па гэтай падпісцы павінны збірацца ўпаўнаважанымі сельсоветаў. Гэтыя дырэктывы ў радзе раёнаў скажаюцца. Па БУДА-КАШАЛЁЎСКАМУ раёну не выпучана ні аднаго ўпаўнаважанага для збору ў калгаснікаў грошай. Сельсоветы, як правіла, у гэтым раёне адхілены ад работы па зборы ўзносаў па падпісцы. Грошы ўносяць не калгаснікі непасрэдна, як гэта патрабуюць дырэктывы, а праўленні калгасаў. Вельмі часта банк не пагашэнне падпіскі калгаснікаў проста спісвае пэўную суму з бягучага рахунка калгаса.

Не лепш работа і з прыцягненнем укладаў у ашчадныя касы. У БАРЫСАЎСКІМ раёне фінансава-крэдытны апарат масавую работу па вярбоўцы ўкладчыкаў падмяніў голым адміністраваннем. На агульных сходах складаюцца спісы жадаючых унесці соцуклад з паказаннем сумы ўклада. Гэтыя спісы перадаюцца бухгальтэрыі прадпрыемстваў для ўтрымання грошай.

Такая «вярбоўка» ўкладаў, апрача кампраметацыі самой ідэі ўклада нічога не дае. Вынікі работы па Барысаўскаму раёну гэта паказалі з усёй выразнасцю. Па калектыву гуты імя Домбаля было завярбавана такім парадкам укладаў на 4.150 руб., а на справе ў касу паступіла толькі 300 руб. Такія факты ёсць і па іншых прадпрыемствах.

Фінансавая работа з'яўляецца надзвычай адказным участкам соцыялістычнага будаўніцтва. Тым больш гэта адказнасць павялічваецца там, дзе прыходзіцца мець справу непасрэдна з шырокімі працоўнымі масамі. Тут кожнае мерапрыемства павінна праводзіцца з усёй чоткасцю, з усёй добрасумленнасцю, з захаваннем высокай класавай пільнасці. Інакш, надзвычай карыснае, правільнае і папулярнае мерапрыемства пры няўмелым яго правядзенні можа ператварыцца ў сваю процілегласць, як гэта атрымалася ў Барысаўскім раёне з соцукладамі.

Нельга абыйсці і фактаў скажэння класавай лініі ў правядзенні сельска-гаспадарчага падатка, якое мела месца ў асобных раёнах. Лепельскі, Лагойскі, Пухавіцкі і інш. раёны, замест выяўлення сапраўдных кулакоў, спекулянтаў, зрыўшчыкаў мерапрыемстваў партыі і ўрада, дапусцілі абкладанне ў індывідуальным парадку працоўных сяран.

Усе прыведзеныя прыклады сведчаць аб тым, што фінансавая работа ў радзе раёнаў яшчэ не ўзнята на належную палітычную вышыню, што яна праводзіцца ад выпадка да выпадка, што шырокая палітычна-масавая работа часта падмяняецца кампанейшчынай, «штурмамі», паходамі, ударнымі дэкаднікамі і пяціднёўкамі. У пагоні за колькаснымі паказальнікамі нярэдка зусім ігнаруецца якаснае выкананне плана.

Зразумела, у далейшым так праводзіць фінансавую работу нельга. Мала рапартаваць аб стопрацантным выкананні агульнага фінансавага плана; трэба забяспечыць ажыццяўленне фінансавай праграмы па кожнаму плацяжу ў паасобку, сурова захоўваючы правільную, выразную ленінскую класавую палітыку.

У чацвёртым квартале ў асноўным фінансавы план вырашаюць добраахвотныя плацяжы і паступленні ад аграмаджанага сектара. Забяспечыць паступленні ў бюджэт звыш 22 млн. руб. па пазыцы другой пяцігодкі, выканаць план фізычных укладаў у ашчадкасы, па паях у спажывецкую кааперацыю, дабіцца поўнага і свачасовага паступлення ў бюджэт каля 60 млн. руб. з даходаў аграмаджанага сектара — вось праграма фінансавай работы чацвертага квартала.

Ні ў якім разе нельга ігнараваць і абавязковыя плацяжы, як сельгаспадатак, акладное страхаванне, падаходны падатак і культзбор у горадзе, ад якіх павінна паступіць у даходную частку бюджэту даволі значная сума, але выкананне якіх усё яшчэ праходзіць незадавальняюча.

Даючы жорсткі адпор класаваму ворагу і яго агентуры — апартуністам, праводзячы пастаянную барацьбу за правільную класавую палітыку, за ўзорнае абслугоўванне пазыкатрымальнікаў і ўкладчыкаў, забяспечым поўнае выкананне фінплана чацвертага квартала і гэтым самым забяспечым бесперабойнае фінансаванне будаўніцтва бясклассавага грамадства і не здадзім пяршынства ў выкананні фінплана першага года другой пяцігодкі.

Пастанова Цэнтральнай камісіі па спаборніцтву з Заходняй вобласцю

Цэнтральная камісія па соцыялістычнаму спаборніцтву з Заходняй вобласцю пастанавіла:

У сувязі з адставаннем СЕННЕНШЧЫНЫ па якасных паказальніках здаваемай ільнапрадукцыі, па групе ільнаводчых раёнаў чырвоны сцяг ЦК і СНК адабраць ад Сенненскага раёна і перадаць яго ДРЫСЕНСКАМУ. Аспрэчваюць сцяг у Дрысеншчыны СЕННЕНСКІ і ПОЛАЦКІ РАЁНЫ.

На групе збожжавых раёнаў чырвоны сцяг ЦК і СНК пакінуць за АРШАНШЧЫНАЙ. Аспрэчваюць сцяг у Аршанскага раёна — АСІПАВІЧЫ, БАБРУЙСК, БЯГОМЛЬ і РАГАЧОЎ.

Чырвоны сцяг ЦВК БССР пакінуць за БАРЫСАЎСКІМ раёнам.

6 лістапада, у 7 г. веч., у памяшканні Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра (Валадарскага, 7)

адбудзецца

УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭННЕ ПЛЕНУМА

менскага гарадскога совета,

прысвечанае **XVI гадавіне Кастрычніцкай рэволюцыі,**

сумесна з представіцелямі партыйных, совецкіх, прафесіянальных, грамадскіх організацый і ўдзельнікамі ўсебеларускіх злётаў ударнікаў прадпрыемстваў і калгаснікаў-ударнікаў.

Члены гарсовета, члены ЦК КП(б)Б, ЦКК КП(б)Б, ЦВК, СНК, ЦК ЛКСМБ, члены гаркома КП(б)Б, гаркома КП(б)Б, ГК ЛКСМБ, члены прэзідыума ЦСПСБ, гарпрафсовета, члены т-ва старых большавікоў, удзельнікі злётаў ударнікаў прадпрыемстваў і калгаснікаў-ударнікаў праходзяць па сваіх мандатах. Астатнія праходзяць па запрашальных білетах, якія можна атрымаць у гарсовеце, пакой № 42.

Прэзідыум гарсовета.

ЗАЗЯБЛЕНА ТОЛЬКІ 54,7 ПРОЦ. ПЛОШЧЫ

Па-большэвіцку змагацца за ўдарнае завяршэнне с.-г. года

Ход зяблёва па БССР на 1 лістапада
(у процантах да гадавога плана)

Усяго зазяблена	Саўгасы	Калгасы	Аднаасобнікі
54,7	82,6	51,1	59,9

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове ад 22 кастрычніка г. г. прапанаваў «ўсім райкомам КП(б)Б, дырэктарам МТС і саўгасаў арганізаваць работу такім чынам, каб да 1 лістапада план зяблёва і цалінны быў безумоўна выкапан».

Тэрмін прайшоў. Як-жа выкананы дырэктыва ЦК?

На 1 лістапада па рэспубліцы зазяблена ўсяго 561.583 га, што складае 54,7 проц. плана. Узнята цаліны 15.286 га—31,6 проц.

Недапушчальная зацяжка зяблёва і ўзнятня цаліны тлумачыцца выключна тым, што ва многіх раёнах БССР злачынна ігнаруецца гэты важнейшы ўчастак сельска-гаспадарчых работ. Даволі ўказаць на **Асвейскі** раён, які выканаў толькі 24,7 проц. плана зяблёва і ўзнёў 15,3 проц. цаліны. **Расонскі** раён адпаведна 23,5 проц. і 11,8 проц.; **Бешанковіцкі** — 21,8 проц. і 0; **Чашніцкі**—25,4 проц. і 17,3 проц.; **Гарадоцкі**—23,9 проц. і 0; **Лёзненскі**—18,5 проц. і 10,6 проц.; **Мсціслаўскі**—26,9 проц. і 8,4 проц. і г. д.

У гэтых раёнах не зразумелі вялізарнага значэння зяблёва для веснавой пасяўкампаніі будучага года.

Замест таго кабажыццявіць дырэктыву ЦК аб пераводзе на зяблёва не менш 80 проц. трактарнага парка і конскую цягавую сілу, у радзе саўгасаў, калгасаў і сельсоветаў зяблёва адкладваюць да зімы, трактарны парк і конская цягавая сіла не скарыстоўваюцца.

Возьмем саўгасы Сіроцінскага раёна. Яны павінны зазяблець 620 га, а зазяблілі толькі... 60 га,—9,7 проц. Саўгасы Гарадоцкага раёна і не распачыналі яшчэ зяблёва, а па плану яны павінны ўзараць 160 га. Такое-ж становішча і па саўгасах Сеннянскага, Талачынскага, Быхаўскага, Камарынскага і Хойніцкага раёнаў. Кіраўнікі гэтых саўгасаў не здолелі правільна расставіць сілы, па-большэвіцку арганізаваць работу з тым, каб у тэрмін скончыць зяблёва.

Па калгаснаму сектару БССР план зяблёва выкананы ўсяго на 51,1 проц.

Калгасы недапушчальна адстаюць у зяблёве, не глядзячы на ўсе магчымасці своячасова выканаць план.

Здолелі-ж у Барысаўскім раёне не толькі выканаць, але і перавыканаць план зяблёва. Здолелі-ж тэрыкаўскія раённыя арганізацыі дабіцца поўнага выканання плана зяблёва да 1-га лістапада. Большавікі Аршанскага раёна забяспечылі выкананне плана зяблёва па ўсіх сектарах. Гэта гаворыць аб тым, што там, дзе раённыя арганізацыі ўразумелі значэнне зяблёва, мабілізавалася на барацьбу за высокі ўраджай 1934 года—там поспех быў забяспечан.

Вопыт перадавікоў павінен быць перанесен у адстаючыя раёны, сельсоветы, калгасы і саўгасы. Неабходна зараз-жа прыняць усе меры, каб мак сімальна ўзмацніць тэмпы зяблёва і у бліжэйшыя 2 дні скончыць гэту работу.

Саўгасы, калгасы і працоўныя аднаасобнікі павінны не забываць, што заваяваць месца ў кастрычніцкіх святах у Менску яны змогуць толькі пры ўмове поўнага завяршэння ўсіх сельска-гаспадарчых работ, у тым ліку і стопроцантнага выканання плана зяблёва.

У РАДАХ ПЕРАДАВІКОЎ

Калгас «Чырвоны піянер», Забэльчанскага сельсовета, у барацьбе за месца ў кастрычніцкай калгаснай калоне дабіўся вялікіх поспехаў.

Калгас скончыў поўнасцю зяблёва. Вялікарыцы, бульбы і затаўшчык ільнанасення і капатель выканан на 100 проц.

Узмоцненымі тэмпамі ідзе апрацоўка і здача дзяржаве ільнавалакна.

Кірайкоў.

Разбіць самацёк і дэкларацыйнасць

(Ад нашага спецыяльнага карэспандэнта)

План бульбапаставак па **Ўраравіцкім** раёне на 1 лістапада выкананн на 62,3 проц. Тэмпы нарастаюць вельмі павольна. На 20 кастрычніка было здана 40,5 проц., на 25-е — 55,6 проц. Што характарызуе ход бульбапаставак па раёне? У верасні, калі пачалося масавае капанне бульбы, ніхто ў раёне не думаў аб арганізацыі паставак. Пасля адпаведнага націску з цэнтра, у кастрычніку быў дасягнут некаторы пералом. Аднак, у пачатку трэцяй дэкады кастрычніка тэмпы зноў знізіліся, пачалася стаўка на «вымачку».

З лёгкай рукі старшыні РВК тав. **КАРАЛЕНКА** сельсоветы былі папярэджаны аб тым, што па закону там, дзе частка бульбы вымакла, пастаўкі адтэрмінаваны. Гэта выклікала дэмабілізацыю. Значная частка сельсоветаў падалася агітацыі кулацкіх элементаў: «Раз даюць адтэрміноўку, значыць можна з бульбай не спяшацца».

Пасля сігналаў «Звязды» аб тым, што Ўраравіцкія раённыя арганізацыі патурэюць кулацкім элементам, была склікана нарада раённага актыва, на якой была растлумачана пастанова аб вымачках. Аднак, гэта нарада яшчэ не дала пералома.

У калгасе імя **Чангарскай дывізіі** на запытанне, чаму не здаецца бульба, член партыі тав. **СКАРЫНА** заявіў: «Старшыня калгаса Закроўскі прапанаваў нам не здаваць бульбы, бо згодна закона аб вымачцы, калгас ад паставак вызвален. Калі пачалі наводзіць справаўкі, хто выказаў калгас ад здачы прадукты дзяржаве, аказалася, што калгас узяў над сваю апеку старшыня РВК тав. **КАРАЛЕНКА.** Гэта ён, разам з Закроўскім хадзіў да ўпаўнаважанага Камзага і хадайнічаў аб поўным адтэрмінаванні паставак бульбы. Між тым, тав. Караленка доб ра ведаў становішча калгаса імя Чангарскай дывізіі. Ён ведаў, што арцель стаў на абарону кулацка-ліквідных элементаў.

Усяго толькі 10 проц. плана паставак бульбы выканаў **Пінчанскі** сельсавет. У гэтым сельсавеце кожнаму аднаасобніку па сходах заявілі: «Колькі хто хоча атрымаць ільнот на вымачцы, няхай атрымае». У выніку гэтага ў сельсавеце пастаўкі на працягу двух тыдняў зусім спыніліся.

Пад заслонай «адтэрмінавак» кулацтва разгарнула шалёную агітацыю супроць паставак. Старшыня калгаса **«РУХАВІК»**, атрымаўшы адтэрміноўку на 80 тон, патрабуе адтэрміноўкі яшчэ на 300, або на 80 проц. усяго плана. Стара-Беліцкі, Іволіцкі, Чабатавіцкі сельсоветы замест таго, каб давесці абавязацельствы да тых аднаасобных гаспадарак, якія сапраўды павінны здаць бульбу, выпісалі абавязацельствы на несіснуючыя гаспадаркі. У гэтых сельсоветах ёсць рад выпадкаў, калі даводзілі заданні да гаспадарак, якія яшчэ вясной абагулілі сваю зямлю і ўступілі ў калгас.

Яшчэ горш стаіць справа са здачай бульбы калгаснікамі з прысядзібных участкаў. Ёсць такія калгаснікі, якія павінны здаць па 20 і больш центн. са сваіх участкаў, але бульбы не здаюць. Яны чакаюць размеркавання калгасных прыбыткаў. Ніхто ў раёне не ўдарыў па гэтых кулацкіх маневрах.

Нізкай увагі не зварачаецца на **якасць прадукцыі.** Здаюць мокрую і дробную бульбу. Бровар адмовіўся прыняць звыш 15 проц. бульбы, якая прынята пунктамі. Калгас «Чырвоны шлях» нядаўна адвёз на бровар самую лепшую бульбу ў колькасці 10 центн. На другі дзень яму ўказалі, што добраякасную бульбу трэба везці на станцыю, а не на завод, што бровар можа пераапрацаваць і бульбу нізкай якасці. Пасля гэтага, каб не везіць ліцішня 6 клм. на станцыю, кіраўнікі калгаса паслалі зноў на бровар 50 фурманак, але знарок не нажрылі бульбу саломіай, каб яна мокла пад дажджом. Для чаго гэта зроблена? Кіраўнікі калгаса могуць зараз скаслацца на тое, што на станцыі такую бульбу [illegible]

На складах Белплодагароднінны пры маюць зусім дробную бульбу—«арэшкі», ніхто за прыёмкай не сочыць, ніхто з кіраўніцтва райканторы Белплодагароднінны за гэтую справу не адказвае. Пабудаваныя хавальнікі, якія каштавалі 12 тыс. руб., працакаюць, бульба часткова гніе.

У раёне шмат калвецыйнай высокаякаснай бульбы. Але, карыстаючыся патураннем раённых кіраўнікоў, многія калгасы і аднаасобнікі здаюць выключна дробную прадукцыю. Замест таго, каб змагацца з кулацка-ліквідацыйнымі настроямі, нам. старшыні РВК **ІСАЧАНКА** хадайнічае перад СНК аб тым, каб павялічыць план здачы бульбы броварам і тым самым зменшыць заданне па адгрузцы гарадам. Ісачанка гэтым хоча узаконіць здачу бульбы нізкай якасці.

У пастанове РК ад 1 лістапада гаворыцца аб тым, што ў сельсоветы послан актыў для ўзмацнення паставак. На справе, актыў адседжваецца ў канцылярыях, у раённым центры. У калгасах, у сельсоветах нізога нема, пастаўкі не арганізаваны. Была пастанова РК аб скасаванні выходных дзён, аб націраванні раду работнікаў у вёску, аднак, гэта пастанова засталася на паперы.

1 лістапада, абгаварыўшы пытанне аб ходзе засатовак бульбы, бюро райкома абмежавалася дэкларацыйнай, асілуйскай рэзалюцыяй. Меры спагнання ў адносінах да зрыўшчыкоў, да тых, хто патурае кулацкаму саботажу, не прынятыя. Сакратар райкома т. **Фрыман** заявіў: «Арцвыязды ў адносінах да ўсіх нас, адказных за зрыў збожжапаставак, зробіць ЦК. Твар картактыва вывяўляць чыстка. А нам кажа чаго караць канкретных вінаватых».

Замест прыцягнення да адказнасці Караленкі і Сапчанкі, Скарыны, Закроўскага і інш. бюро райкома перадаверыла гэту справу РКК і даручыла апошняй на працягу бліжэйшых дзён разгледзець гэтае пытанне.

Ўраравіцкі РК і РВК не хочуць арганізаваць бульбапаставак. Яны не жадаюць выкрыць натхніцеляў кулацкага саботажа для таго, каб навучыць усю партыйную арганізацыю па-большэвіцку змагацца за ўдарнае завяршэнне с.-г. года. Райком праяўляе яўную палітычную слепату ў адносінах да важнейшай задачы.

Л. К.

Да працоўных усяго света
Адозва Выканкома МОПР'а

7-га лістапада 1933 г. споўняецца XVI гадавіна пераможнай Кастрычніцкай рэволюцыі. 16 год барацьбы і перамог. 16 год горда рэе сцяг пролетарскай рэволюцыі, сцяг дыктатуры пролетарыята на адной шостай зямной кулі.

У КРАІНАХ КАПІТАЛА — нябачаны эканамічны крызіс, масавае беспрацоўе, беспрасветная беднасць і голад...

У КРАІНЕ СОВЕТАЎ — магутны рост народнай гаспадаркі, нябачаныя поспехі соцыялістычнага будаўніцтва, новыя гіганты індустрыі, новыя жылёвыя памяшканні для рабочых, новыя школы для дзяцей працоўных...

У КРАІНАХ КАПІТАЛА — белы тэрор супроць працоўных мас, катаванні і расстрэлы, крывавая расправа з перадавымі барацьбітамі рабочага класа і сялянства, ліхаманкавая падрыхтоўка новых імперыялістычных войн...

У КРАІНЕ СОВЕТАЎ — мірная творчая праца ўсіх нацыянальнасцяй, брацкі саюз народаў СССР для справы пабудовы соцыялістычнага грамадства.

У КРАІНАХ КАПІТАЛА — закрываюцца фабрыкі, тушацца домны, знішчаюцца варштаты і машыны, угасае тэхнічная думка, дзесяткі тысяч інжынераў і тэхнікаў без працы...

У КРАІНЕ СОВЕТАЎ — бліскучыя дасягненні навукі і тэхнікі, тысячы рабочых-вынаходнікаў на службе соцыялістычнага будаўніцтва, рэкордны палёт совецкіх пілотаў у стратасферу, Каракумскі прабег совецкіх аўтамашын, паспяховыя экспедыцыі совецкіх вучоных і маракоў у Арктыку. Вызваленая ад панцугоў капіталізма краіна Советаў магутна развівае свае прадукцыйныя сілы, няўхільна павышаючы матэрыяльны і культурны ўзровень мас.

Заблытаўшыся ў сецях уласных супярэчнасцяй, капіталістычны свет імкнецца знайсці «выхад» з крызіса за кошт далейшай нястрымнай эксплаатацыі мас шляхам нябачанага яшчэ паходу супроць элементарных праў працоўных. У сэрцы Эўропы, у Германіі, фашысцкія каты кінулі ў турмы і канцэнтрацыйныя лагеры дзесяткі тысяч працоўных; у Балгарыі новыя смяротныя прыгаворы супроць рэволюцыйных салдат; на востраве Куба паўночна-амерыканскія імперыялісты дапамагаюць мясцовай буржуазіі душыць рэволюцыйнае паўстанне народа; па-ранейшаму вісіць пагроза кары смерцю над галовамі нявінных юнакоў Скотсборо; па-ранейшаму пакутуе ў Каліфорніі спаўны барацьбіт Том Муні; у кітайскай турма пакутуюць прыгаворваныя да пажыццёвага зняволення Паўль і Гертруда Руэг; яшчэ не вызвалены міручкія вязні ў Індыі. УСЮДЫ, ДЗЕ ПАНУЕ КАПІТАЛ, ЛЬЕЦЦА КРОЎ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН.

Шалёны разгул шавінізма, нацыяналізма і расавай нянавісці — павінен падрыхтаваць абстаноўку для новай імперыялістычнай вайны, для ўзброенага паходу супроць бацькаўшчыны пролетарыяў усяго света — супроць СССР. Пры агульным нябачаным падзенні вытворчасці ва ўсіх краінах капіталу толькі «фабрыкі смерці» — фабрыкі зброі працуюць поўным ходам. Не сустракаючы супраціўлення з боку здрадніка ў кітайскага народа — Гаміндана, японскія імперыялісты захапілі велізарныя тэрыторыі Кітая і рыхтуюцца да новых заваяванняў. На Далёкім усходзе японскія імперыялісты і іх стаўленнікі з Манчжоу-го рыхтуюцца да захопа Кітайска-Ўсходняй чыгункі—уласнасці СССР, арыштоўваюць совецкіх грамадзян, рыхтуюць новыя правакацыі, якія маюць мэтай уцягнуць СССР у вайну.

У гэтыя грозныя дні, капі рэволюцыйнае абурэнне мас нарастае з кожным днём, капі ў баях з фашызмам і белым тэрорам мацнее баявое адзінства мас, МОПР ЗВАРАЧАЕЦЦА З ЗАКЛІКАМ ДА ПРАЦОЎНЫХ УСЯГО СВЕТА, ДА МІЛЬЁНАЎ СВАІХ ЧЛЕНАЎ:

ПАГЛЯДЗІЦЕ НА СССР, які ўказвае вам шлях. Паглядзіце, як жывуць і змагаюцца працоўныя СССР, свабоднай краіны соцыялізма. Абараняйце краіну Советаў — бацькаўшчыну міжнароднага пролетарыята.

РАБОЧЫЯ, СЯЛЯНЕ, ПРАЦОЎНАЯ ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ, ПРЫГНЕЧАНЫЯ НАРОДЫ КАЛОНІЙ І ПОЎКАЛОНІЙ, ПРАЦОЎНЫЯ ЎСІХ КРАІН, РАС І НАРОДАЎ, шчыльней рады ў барацьбе з фашызмам і белым тэрорам! Падымі це свой магутны голас пратэста супроць гвалта і зверства капіталістычнага лада!

МОПРАЎЦЫ ЎСЯГО СВЕТА! Бярыце прыклад з спаўнай арганізацыі МОПР Совецкага саюза, вучыцеся на вопыце гэтай 10-мільённай арганізацыі выхоўваць масы ў духу баявога пролетарскага інтэрнацыяналізма!

У дзень свята XVI гадавіны Кастрычніка ВЫСТУПАЙЦЕ ЎСЮДЫ — у гарадах і сёлах, на пляцах і фабрыках — супроць белага тэрора і фашызма, супроць новых войн, за рэволюцыйную салідарнасць працоўных усяго света, за Совецкі саюз.

Няхай у дзень 7-га лістапада ад края да края зямлі магутна прагучаць нашы прызыўныя лозунгі:

Няхай жыве Совецкі саюз, бацькаўшчына міжнароднага пролетарыята!

Няхай жыве міжнародная салідарнасць працоўных!

Няхай жыве адзіны баявы фронт мас у барацьбе з фашызмам і белым тэрорам!

Няхай жыве МОПР!

ВЫКАНКОМ МОПР.

Тэлеграма прэзідэнта Турэцкай рэспублікі Газі Мустафа Кемаль-пашы— старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР тав. М. І. КАЛІНІНУ

п. КАЛІНІНУ — СТАРШЫНІ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА СССР. МАСКВА.

З жывым задавальненнем я атрымаў тэлеграму, якую Вы пажадалі накіраваць мне ў дзень 10-годдзя рэспублікі. Чулая ўвага Цэнтральнага выканаўчага камітэта Вялікай прыязнай краіны, паслаўшаса для ўдзела ў нашых святкаваннях дэлегацыю, узначаленую такой выдатнай асобаю, якой з'яўляецца п. Варашылаў, нас жывы расчуліла. Радасць, якую мы перажываем у гэтыя дні вялікага свята, была памножана прысутнасцю побач з намі нашых прыяцеляў. Сочачы з першых дзён з жывою цікавасцю за вялікімі поспехамі, дасягнутымі вялікай суседняй і прыязнай краінай ва ўсіх галінах эканамічнага, індустрыяльнага, сельска-гаспадарчага і культурнага жыцця, я прымаю з удзячнасцю словы, якімі Вы вызначаеце поспех у нашых задачах і мой асабісты ўдзел у рэалізацыі справы перабудовы. Роўным чынам я перакананы, што дзесятая гадавіна нашай рэспублікі, якая святкуецца з бліскучым і сардэчным удзелам дэлегацыі СССР, паслужыць усё к большаму ўмацаванню непарушнай турэцка-совецкай дружбы. Шлю ўсю ўдзячнасць і самыя шчырыя пажаданні працвітання народаў СССР.

Газі Мустафа Кемаль.

ТЭЛЕГРАМА СТАРШЫНІ СОВЕТА МІНІСТРАЎ ТУРЭЦКАЙ РЭСПУБЛІКІ ІСМЕТ-ПАШЫ СТАРШЫНІ СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ СССР тав. В. М. МОЛАТАВУ

П. МОЛАТАВУ, СТАРШЫНІ СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ. МАСКВА.

Горача дзякую вам за вашае віншаванне і высокія і сяброўскія пачуцці, якія вы пажадалі выказаць мне ў дзень Х-годдзя рэспублікі. Дні энтузіязма і радасці, перажываемыя намі, яшчэ больш радосны для нас, дзякуючы актыўнаму ўдзелу, які пажадаў у іх прыняць урад СССР у асобе яго выдатных дэлегатаў. Турэцка-совецкая дружба з самага свайго ўзнікнення развівалася ў напрамку шырэйшага і лаяльнага супрацоўніцтва на карысць міра, якому яна аказала найбольш адэкватныя ўслугі. З прыяцелямі першых дзён Турэцкай рэспублікі мы звязаны непарушнымі ўзамі. Да вялікіх тварцоў бліскучага будаўніцтва, канстатаванага мною асабіста звернута ўсё наша захапленне, і нашы самыя шчырыя пажаданні поспеху суправаджаюць развіццё вашых бліскучых намаганняў.

Ісмет.

Тэлеграма міністра замежных спраў Турэцкай рэспублікі Тэфік Рушцю-бея народнаму камісару па замежных справах СССР тав. М. М. ЛІТВІНАВУ

Народны камісар па замежных справах тав. Літвінаў, які спыніўся ў Парыжы праездам у Вашынгтон, атрымаў ад міністра замежных спраў Турэцкай рэспублікі Тэфік Рушцю-бея наступную тэлеграму:

«З найглыбейшай удзячнасцю і вялікім задавальненнем атрымаў Ваш ліст і такую сардэчную тэлеграму, якую вам пажадана было паслаць у дзень Х-годдзя Турэцкай рэспублікі — нацыянальнага свята. Ад усяго сэрца дзякую за такое любезнае і шчырае віншаванне. Няма патрэбы гаварыць, як мы шкадуем, што ў гэтыя святочныя дні мы пазбаўлены задавальнення бачыць найдаражэйшага госця, аднаго з нашых найвялікшых і найлепшых прыяцеляў. Мы святкуем пачаслівую падзею сумесна з вашымі выдатнымі дэлегатамі, дарагімі гасцямі і прыяцелямі, памяталочы

Конкурс-спаборніцтва на лепшую пастаноўку калгаснага ўліку

Умовы і парадак правядзення соцспаборніцтва на лепшую пастаноўку ўліку ў калгасах БССР

Усебеларускае спаборніцтва на лепшую пастаноўку ўліку ў калгасах БССР у адпаведнасці з пастановай ЦК КП(б)Б (газ. «Звязда» ад 18-X-33 г.) праводзіцца з 10 лістапада 1933 г. па 20 студзеня 1934 г.

Апошні тэрмін уключэння ў соцспаборніцтва калгасаў—25 лістапада 1933 года.

I. Задачы і парадак конкурса

Улік у калгасах з'яўляецца адным з важнейшых вагароў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў. Правільная пастаноўка ўліку ў калгасах з'яўляецца асновай для аперацыйнага планавага кіраўніцтва калгаснай гаспадаркай, важнейшай зброяй у барацьбе з расцвітваннем, вашчэннем і разбазарваннем калгаснай маемасці з боку кулацкіх і шкодніцкіх элементаў, накіраваных на падрыў грамадскай уласнасці.

Аспэўнай мэтай конкурса-спаборніцтва з'яўляецца ўзнятае масы калгаснікаў і калгасных рахункаводаў на барацьбу за ўзорную пастаноўку ўліку і справаздачнасці ў калгасах, выяўленне лепшага вопыта перадавых калгасаў у справе пастаноўкі ўліку і справаздачнасці і перанясення гэтага вопыта ва ўсе калгасы БССР.

Спаборніцтва праводзіцца паміж па асобнымі калгасамі.

Цэнтральнай фігурай спаборніцтва і арганізатарам яго ўнутры калгаса

II. Конкурс-агляд на лепшую пастаноўку ўліку ў калгасах праводзіцца па наступных паказальніках:

А. Асноўныя паказальнікі агляду

1. Сістэма ўліку, прынятая ў калгасе (простая ці падвойная) і адпаведнасць яе вядзенню існуючым інструкцыям Наркамзема Саюза.

2. Дакладнасць уліку і даступнасць усіх запісаў зразумоўнаю калгаснікаў.

3. Адпаведнасць сістэмы ўліку ўмовам і патрабаванням калгаснай вытворчасці.

4. Даступнасць і зразумеласць дадзенай сістэмы ўліку работнікам, якія непасрэдна ажыццяўляюць улік у калгасах (бухгалтары, рахункаводы, вучотчыкі, брыгадзіры, загадчыкі ТФ і паасобных галін гаспадарак і прадпрыемстваў, кладаўшчыкі і іншыя), праўленням, рэвіз. камісіям і калгаснаму актыву.

Б. Арганізацыя і пастаноўка ўліку ў калгасах

а) Правільнае і дасканалае размеркаванне ўсіх абавязкаў па вядзенню ўліку паміж вышэйпералічанымі выканаўцамі калгасаў і паяўнасць гэтага распарадка ў выглядзе пісьмовых «інструкцый унутранага распарадка» ў штодзённай працы калгасаў.

[illegible] калгасаў у галіне кантроля і рэвізіі рахункаводства з мэтай яго палепшэння (каляндарныя планы работ, прыцягненне актыва да працы, абагуленне вываду рэвізіі ўліку на агульных сходах і г. д.).

в) Дакладнае, выразнае і своечасовае складанне першапачатковых дакумантаў па ўсіх галінах і па ўсіх аперацыях вытворча-фінансавай і гаспадарчай дзейнасці калгасаў.

В. Улік працы

1. Штодзённы дакладны і своечасовы ўлік работы, выкананай брыгадай, групай, звяном і кожным калгаснікам у паасобку.

2. Правільнае і своечасовае складанне штодзённых даніясненняў, пайменных пералікаў па ўсіх галінах вытворчасці і гаспадарчай дзейнасці калгасаў.

3. Дакладнае і своечасовае ніліраванне працадзён у поўнай адпаведнасці з колькасцю і якасцю працы, зробленай кожным калгаснікам і згодна існуючых зацверджаных норм выпрацоўкі.

4. Рэгулярны запіс выкананай працы: а) налічэнне працадзён у працоўнай кніжцы калгаснікаў з абавязковымі адзнакамі ў ёй дадатковага налічэння за добраякасную працу або аб зніжэнні працадзён за дрэнную працу;

б) вядзенне запісаў у кнізе ўліку працадзён калгаса і па галінных ведамасцях аб наліччэнні працадзён, а таксама і ў асабістых рахунках па разліку з калгаснікамі;

в) дасканалы і своечасовы ўлік працы па асобных галінах гаспадаркі і дапаможных прадпрыемствах калгасаў, асабліва па СКТФ і МТФ.

5. Набліжэнне ўліку працы да мас калгаснікаў у іх барацьбе за выкананне вытворчых планаў у калгасах: а) улік спаборніцтва і ўдарніцтва паміж брыгадамі, групамі і паасобнымі калгаснікамі; б) рэгулярнае асвятленне сярод калгаснікаў хода выканання вытворчага плана шляхам выкарыстання даных уліку (дошка спаборніцтва калгасаў, насценгазета і раённы друк).

Г. Улік маемасных і прадуктова-матэрыяльных каштоўнасцяй

1. Улік маемасці калгасаў:

а) правільнае і своечасовае адлюстраванне ў ліку ўсяго інвентара і маёмасці, будынкаў, пабудоў; в) улік інвентара, прыналежнага да брыгады.

2. Улік прадуктаў і матэрыялаў як у калгаса калгаса, так і па ўчастках, брыгадах, складах і дапаможных вытворчых прадпрыемствах калгаса.

3. Своечасовы і дасканалы ўлік прадукцыі па ўсіх стадыях уборкі, абмалота і захавання; улік жывёлы (прыплод, гадоўля і перавод з адной узроснай групы ў другую, а таксама і па адкорм): а) цягавай сілы, б) прадукцыйнай жывёлы на фермах і па-за фермамі.

4. Дакладны і своечасовы ўлік паступкаў і расходавання прадуктаў з насенных, страхавых і фуражных фондаў, а таксама і з вызначаных для калгаснага гандля і патрэб унутрыкалгаснага характару (сталоўны, яслям, школе, бальніцы і г. д.).

Д. Улік фінансавай дзейнасці калгасаў

1. Паўнасць своечасова складзеных гадавога і квартальных фінансавых планаў і дасканалы ўлік іх выканання.

2. Улік грашовых сродкаў калгасаў і барацьба за мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў.

3. Улік адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў і барацьба за іх скарачэнне да норм, устаноўленых пастановай НКЗ СССР.

4. Улік грашовых разлікаў з дзяржавай, па калгаснаму гандлю, улік крэдытаў і іх пагашэнне ў тэрмін.

5. Улік грашовых разлікаў з калгаснікамі.

6. Акуратнае вядзенне касавай кнігі і ўліку ўласных сродкаў у банку і ў ашчадкасе.

Е. Улік капітальнага будаўніцтва і рамонта

1. Правільны, дакладны і своечасовы ўлік прыхода і выдаткаў будаўнічых матэрыялаў. Улік выканання будаўнічых работ у адпаведнасці з зацверджанымі планамі і кашторысамі.

2. Своечасовае афармленне і прымане на вучот скончанага капітальнага будаўніцтва і рамонта.

Ж. Улік даходаў, ураджаю і іх размеркавання

1. Поўны, дасканалы ўлік натуральнай прадукцыі і грашовых сродкаў, падлягаючых размеркаванню на працадзён сярод калгаснікаў.

2. Своечасовае і добраякаснае складанне і правільнае размеркаванне даходаў і ўраджаю ў адпаведнасці з апошнімі ўказаннямі партыі і ўрада на гэтаму пытанню.

3. Своечасовае складанне разлікоўных ведамасцяй на выдачу калгаснікам прадуктаў і грашовых сродкаў, згодна зацверджанага плана размеркавання.

4. Своечасовы разлік з калгаснікамі на падставе зацверджанага плана размеркавання і добраякаснае адлюстраванне гэтага разліку ў асабістых рахунках калгаснікаў.

5. Асвятленне ў лічбах сярод пырокіх мас калгаснікаў вынікаў размеркавання ўраджаю (вага прадукцыі і колькасць прадукцыі, якая прыпадаецца кожнаму калгаснику за год працы).

З. Гадавая і аперацыйная справаздачнасць калгасаў

1. Паўнасць дакладнай, усебаковай, правільна і ў тэрмін складзенай гадавой справаздачы ў поўнай адпаведнасці з інструкцыяй Наркамзема.

2. Правядзенне гадавой справаздачы як масава-грамадскай палітычнай кампаніі.

3. Своечасовае і правільнае складанне і правядзенне аперацыйнай справаздачнасці, згодна патрабаванняў Наркамзема і кіраўніцтва народна-гаспадарчага ўліку (квартальныя, месячныя, дэкадныя і інш.).

III. Кіраўніцтва спаборніцтвам

1. Агульнае кіраўніцтва спаборніцтвам ажыццяўляецца рэспубліканскай камісіяй спаборніцтва ў складзе прад стаўнікоў наступных ведамстваў і грамадскіх арганізацый: ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, НК РСІ, НКЗ, БНГУ, дзяржкамісіі ўраджайнасці, Сацэкабанка, саюза рабочых МТС і батрацтва і рэдакцыі газеты «Калгаснік Беларусі».

2. Для штодзённага нагляда і кіраўніцтва рэспубліканская камісія спаборніцтва вылучае са свайго складу пастаянны рабочы прэзідыум.

3. У раёнах непасрэдна кіраўніцтва і нагляд за ходам спаборніцтва ажыццяўляецца раённымі камісіямі, якія стварацца пры рэдакцыях раённых газет.

Раённая камісія вылучае таксама са свайго боку рабочых прэзідыума.

4. Рэспубліканская і раённыя камісіі па спаборніцтву ажыццяўляюць:

а) адбор і рэгістрацыю спаборнічаючых калгасаў;

б) штодзенны нагляд за ходам спаборніцтва;

в) праверку спаборнічаючых калгасаў;

г) асвятленне хода спаборніцтва і вынікаў яго ў рэспубліканскім і раённым друку;

д) праверку становішча ўліку ў спаборнічаючых калгасах;

е) падрыхтоўку калгатковых вынікаў спаборніцтва і адбор кандыдатур для прэміявання.

IV. Праверка і асвятленне хода спаборніцтва ў друку

1. Праверка спаборніцтва калгасаў у галіне пастаноўкі ўліку і справаздачнасці ажыццяўляецца брыгадамі, складаемымі рэспубліканскай і раённымі камісіямі.

2. Як правіла, кожны спаборнічаючы калгас правяраецца не менш 2-х раз: адзін раз у ходзе спаборніцтва і другі—пры падвядзенні вынікаў.

3. У большасці па прэзідыуме спаборнічаючых калгасаў з тым, каб па магчымасці больш поўна ажыццяўляць жывы абмен вопытам і грамадскі ўзаемакантроль паміж калгасамі.

4. Аб выніках кожнага абследвання брыгада на месцы складае падрабязны акт, адзін экзэмпляр якога дасылае рэспубліканскай камісіі.

5. Ход спаборніцтва і калгатковыя яго рэзультаты сістэматычна асвятляюцца [illegible] спаборнічаючых калгасаў, прымаючых удзел у соц. спаборніцтве.

V. Прэміяванне

1. Для прэміявання калгасаў, узорна пастаўленых у сваё справу ўліку ў залежнасці з умовамі конкурса, а таксама працаўшкоў, звязаных з улікам, устанаўліваюцца прэміі.

2. Кандыдаты на прэміяванне выдзяляюцца раённымі камісіямі спаборніцтва. Зацвярджэнне кандыдатаў на прэмію і размеркаванне сярод іх прэміі праводзіцца рэспубліканскай камісіяй.

3. Для прэміявання лепшых па пастаноўцы ўліку і справаздачнасці калгасаў вызначаюцца наступныя прэміі:

2 прэміі па 1.000 руб.
2 прэміі па 750 руб.
3 прэміі па 500 руб.

РАЗАМ: 7 прэмій на 5.000 руб.

Для прэміявання лепшых працаўнікоў, звязаных з улікам па калгасу, як бухгалтароў, рахункаводаў, нам. рахункаводаў, вучотчыкаў, брыгадзіраў, старшынь і членаў праўленняў калгасаў, загатчыкаў фермамі і гаспадарак (за кіраўніцтва ўлікам), старшынь і членаў рэвіз. камісій (за стан кантроль і рэвізію калгасаў з мэтай наладжання ўліку)—выдзяляюцца наступныя прэміі:

2 прэміі па 500 руб.
4 прэміі па 250 руб.
6 прэмій па 150 руб.
11 прэмій па 100 руб.

РАЗАМ: 23 прэміі на 4.000 руб.

Для прэміявання за паасобныя рацыяналізатарскія прапановы, выкарыстаныя і мерапрыемствы ў галіне ўліку выдзяляюцца наступныя прэміі:

4 прэміі па 150 руб.
4 прэміі па 100 руб.

РАЗАМ: 8 прэмій на 1.000 руб.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ СПАБОРНІЦТВА

Адрас камісіі: Менск, Совецкая 71, Наркамзем БССР.

Прывесці трактарны парк у баявую гатоўнасць

За здаровы трактар

Да ўсіх механікаў-брыгадзіраў саўгасаў і МТС

Сабраўшыся на вытворчую нараду механікаў-брыгадзіраў саўгасаў ВІЦЕБСКАГА МАЛПРАМТРЭСТА, мы падвялі вынікі скарыстання трактарнага парка на палявых работах у 1933 годзе.

Вынікі дрэнныя! Трактары не выпрацавалі вызначаных гадзін, не выканалі вытворчых заданняў. Мы не здолелі як след скарыстаць складанейшыя машыны ў сельскай гаспадарцы.

Чым гэта тлумачыцца? Перш за ўсё дрэнным рамонтам трактараў, нядбайнымі адносінамі механікаў-брыгадзіраў да якасці рамонта. Вельмі часта ў рамонтную кампанію 1932-33 года трактары рамантаваліся па прынцыпу «абы з рук». З рамонта трактары прымаліся без кантроля і тэхнічнага агляду. Рамонт быў дрэнным і дарагім.

Выдаткаванне запчастак і выбраковўка старых рабілася па-рвацку. Людзі стваралі скрытыя рэзервы запасных частак, а потым крычалі, што з-за недахвата іх яны не могуць працаваць. Гэта не давала магчымасці планавым органам своечасова забяспечваць запчастакамі.

Трактарысты не інструктаваліся. Сярод іх не праводзілася вытворчых нарад. Тэхнічных гурткоў па павышэнні кваліфікацыі трактарыстаў не было. Соцспаборніцтва было разгорнута толькі на паперы.

Гаручае і змазачныя матэрыялы выдаткаваліся бесконтрольна. Не вялося барацьбы за эканомію гаручага.

Усё гэта прывяло да вялікіх прастояў, да паўторнага рамонта трактараў, перарасходу гаручага і змазачных матэрыялаў, перавыдаткавання запчастак. Таму каэфіцыент карыснага скарыстання трактараў вельмі нізкі.

Гэта магло здарыцца таму, што ў нас за рулём трактараў у майстэрнях вельмі часта сядзелі варожыя нам людзі, якіх мы не змаглі своечасова выкрыць і ўбраць. Мы абавязаны зараз ачысціць свае рады ад людзей, выпадкова і наўмысна (для таго, каб шкодзіць) трапіўшых на адказнейшы фронт індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі.

У надыходзячую рамонтную кампанію практычна мы бярэмся зрабіць наступнае:

Выканаць загад наркома саўгасаў тав. ЮРКІНА аб правядзенні асенне-зімовага рамонта трактараў і прычапнога інвентара ў 1933-34 годзе. Поўнасцю правесці ў жыццё пастанову СПА аб скарыстанні трактараў. Папярэдня шырока прапрацаваць гэтыя пастановы на вытворчых нарадах механікаў, брыгадзіраў, трактарыстаў, рабочых рамонтных майстэрняў і рабочых саўгасаў.

Увесь машынны парк грунтоўна праверыць, ачысціць, змазаць і падрыхтаваць да зімовай стаянкі.

Вядучы барацьбу з класавым ворагам, недысцыплінаванасцю, разгільдяйствам, — даб'ёмся высокаякаснага рамонта трактараў і прычапнога інвентара.

Мы зварочваемся да ўсіх механікаў-брыгадзіраў саўгасаў і МТС з заклікам ударна правесці рамонт гэтага года, добра захаваць ад псавання ўсе трактары і прычапны інвентар, каб большавіцкую вясну другога года другой пяцігодкі сустрэць здаровым, магутным, здольным хутка выканаць ускладзеныя задачы машына-трактарным паркам.

Руль трактара даверыць пролетарска-вытрыманым, праверанным на рабоце людзям.

УДЗЕЛЬНІКІ ВЫТВОРЧАЙ НАРАДЫ БРЫГАДЗІРАЎ МЕХАНІКАЎ:

ФРЫД, СЕЛІВАНАЎ, КОНЮХАЎ, КАЛЬНЕТ, КУЛАКОЎ, УРБАН, КАМСЮК, ВЕРЖБІЦКІ, ШПАКОЎСКІ, РАТКОЎСКІ, БАРАНКОЎ, КІНДЗЕЛЕЎ, ФІЛОНЕНКА, МІРОНАЎ.

Могілкі машын

У Дрыбінскай МТС трактары і сельгасмашыны абзялічаны. Старшы механік МТС **ЯЗВІНСКІ** безадказна адносіцца да каштоўнай дзяржаўнай маемасці.

Трактары на нарыпок зараслі брудам, пажаўцеў прычапны інвентар (плугі, бароны, сеялкі і інш.). Ні загадчыкі ўчасткаў, ні раз'язныя механікі не ведаюць, дзе і колькі машын знаходзіцца, апошнія раскіданы паўсюды. У любым калгасе можна знайсці тую або іншую машыну, аб якой МТС нават і не ведае. Яны стаяць пад адкрытым небам, заіржавелыя.

У многіх машын не хапае частак: апошнія засталіся на полі або расцярушаны.

Бесгаспадарчасць пануе і на цэнтральнай сядзібе МТС. Гэта не сядзіба, а могілкі машын і запасных частак.

Часта ў МТС робяць так: папсавалася машына, дык разбіраюць другую ностую і бяруць ад яе патрэбную частку. У выніку такога шкодніцтва 8 ільнацэрабілак «Кожсамолка» зусім не працавалі сёлетні сезон.

МЕШКЕС.

Без планаў і абсталявання

У мінулым годзе Рагачоўская машына-трактарная майстэрня правяла рамонт трактараў, матораў і скла[illegible] [illegible] Саюз[illegible] [illegible] Гамарнага варштата, трохсем пікаў і інш. Нават напільнікаў і тых няма ў выстарчальнай колькасці.

МТМ патрэбен рухавік у 50-55 сіл. 12-сільны рухавік, які ёсць, ні ў якім разе не можа абслугоўваць работу МТМ у даве змены. Не хапае [illegible] [illegible] і інш. Нават напільнікаў і тых няма ў выстарчальнай колькасці.

Рэдактар газеты палітаддзела Рагачоўскай МТС ВЯРХОЎСКІ.

ЧАМУ ЗАТРЫМЛІВАЕЦЦА БУДАЎНІЦТВА МТМ

Наркамзем СССР абяцяў усе МТС апрамантаваць у кастрычніку не менш 8 проц. трактарнага парка. Аднак, кастрычніцкі план рамонта сорваны і толькі таму, што яшчэ дагэтуль не скончана будаўніцтва і абсталяванне машына-трактарных майстэрняў.

Так, не скончана будаўніцтва **Полацкай і Цялушскай МТМ** (сістэма Бульбатрактарацэнтра). У майстэрнях не зроблена падлога, столь, няма ўнутранага асвятлення. Адпушчаныя на будаўніцтва 12.000 рублёў выдаткаваны не па прызначэнні.

Дрэнна з абсталяваннем МТМ. Тэхнік рамонтна-тэхнічнага сектара Бульбатрактарацэнтра тав. **АПАНАСІМАВА** такае, пакуль будзе скончана поўнасцю ўсё будаўніцтва, замест таго, каб ужо зараз узяцца за работу.

Віцебская МТМ, адна з буйнейшых машына-трактарных майстэрняў, на сёмнаццаты дзень яшчэ не заблакавана паваат такарным варштатам. Лепкая і Рагачоўская МТМ не маюць рухавікоў.

Бульбатрактарацэнтр абнежаваўся фармальным заключэннем дагавора з канторай Электрасельбуда на электрыфікацыю Гомельскай, Віцебскай і Полацкай МТМ, а практычна зусім не правярае, як выконваецца гэты дагавор. Сродкі на электрыфікацыю яшчэ не ступчаны.

Дзяржынскай МТС трэба было выкупіць матор, коштам у 1000 рублёў. Гэта не было своечасова зроблена і матор пралежаў на станцыі каля паўтара месяца.

Не лепш справа стаіць і па **Збіжжатрактарацэнтры.** Будаўніцтва і абсталяванне Дамаснавіцкай МТМ не скончана. З-за адсутнасці сродкаў не прыступлена яшчэ да электрыфікацыі МТМ. Будаўніцтва МТМ малога абёма пры Любавьскай МТС выканана толькі на 4 проц., пры Пухавічскай МТС—на 67 проц., пры Плешчаніцкай—на 68 проц. Між тым, тэрмін скончэння будаўніцтва—5 лістапада.

Сорван рамонт майстэрні ў саўгасе **Дашкаўка** Сапуноредпроста. МТМ не зацеплена, не адрамантавана падлога, не атынкаваны сцены.

Белсельгаснаб вельмі неакуратна выконвае заказы для МТМ. Бульбатрактарацэнтр замацаваў Белсельгаснабу 10.000 рублёў за два гэтаны шкла і даў разнарадку на МТМ. Белсельгаснаб, аднак, патрэбную колькасць шкла не даставіў. Так, Клімавіцкай МТМ замест 45 сэрыяў шкла дастаўлена толькі 15, Крычаўскай замест 19—7.

Характэрна, што нікто адпускай МТМ за паўпуны разлік, у той час як Бульбатрактарацэнтр за гэта шкло адразу ўсю заплаціў. Шкло дастаўляецца на 70 проц. бітае.

ШАПІРА.

Зрываюць конкурс па мясапастаўках

(Лист калгасніка)

Паводле загада Наркамзмаба БССР ад 14 кастрычніка абвешчан усебеларускі конкурс на лепшае выкананне 15-месячнага плана мясапаставак дзяржаве.

Сяненская кантора Загатжывёлы, якая павінна была ўключыцца ў яго, аб'ектыўна ўмовы конкурса. Да гэтага часу ў раёне няма спецыяльнай базы для прыёма жывёлы. Старая база зашыла трэсню, з-за антысанітарнага ўтрымання зачынена. З гэтага часу прайшло ўжо больш 2-х месяцаў, але па будаўніцтву новай базы кіраўніцтвам канторы не прынята ніякіх мер.

Адсутнасць базы прыводзіць да вялікіх страт жывой вагі жывёлы. Апошняя стаіць на мясным дворе ў яраі і своечасова не корміцца. Калгаснікам і працоўным аднаасобнікам, якія прыводзяць жывёлу для здачы, прыходзіцца марна працаваць час, каб адпускаць прыёмшчыка, бо сталага месца для прыёма жывёлы няма. Прыёмшчыку таксама даводзіцца шукаць бегаць па мястэчку і абёрваць у адно месца мясапастаўкі.

Вось, дзе важыцца жывёле, стаіць у яраі пад адкрытым небам ды дрыжэць. Ніхто з кіраўнікоў канторы не хоча пацікавіцца аб лепшым захаванні іх.

Усе [illegible] абмяркоўваецца на вачах РК партыі, райвыканкома, але канкрэтных мер, якія-б забяспечылі поспех работы канторы Загатжывёлы, не прынята да гэтуль.

ЗДАТЧЫК.

АД РЭДАКЦЫІ: Белкантора Загатжывёлы павінна зацікавіцца работай Сяненскай канторы і прыняць тэрміновыя меры, якія-б забяспечылі поспех выканання плана мясапаставак у раёне.

А. Хацкевіч

За далейшыя соцыялістычныя накапленні, за фінансава-бюджэтную дысцыпліну і рэжым эканоміі

Рабочы клас і працоўныя Совецкага саюза дасягнулі суседства-гістарычных поспехаў у ажыццяўленні велізарнейшай праграмы соцыялістычнага будаўніцтва. Пад кіраўніцтвам большэвістычнай партыі і яе ленінскага ЦК на чале з геніяльным правадыром сусветнага пролетарыята тав. **Сталіным**, Совецкі саюз ператвораны з адсталай аграрнай краіны ў краіну індустрыяльную. Створана моцная тэхнічная база прамысловасці для рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. За чатыры з чвэрцай гады абём капітальных укладанняў у арамадманы сектар народнай гаспадаркі Саюза ССР склаў 52,5 мард. руб., у тым ліку ў прамысловае будаўніцтва 24,8 мард. руб.

Фінансавая сістэма ў барацьбе за паспяховае выкананне задач соцыялістычнага будаўніцтва адыграла вялікую ролю. Яна з'явілася магутным вагаром партыі і савецкай у барацьбе за пашырэнне існуючых і адшукванне новых крынік соцыялістычных накапленняў, у барацьбе за ўкараненне гаспадарчага разрахунка ва ўсіх звенях гаспадарчай сістэмы.

Значэнне фінансавай сістэмы не памяншаецца ні ў якай меры і ў другой пяцігодцы. Наадварот, роля яе ўзрастае і ўзмацняецца. Базовай праграмай застаецца і ў далейшым указанне правадыра партыі тав. **Сталіна:** «Сутнасць большэвіцкага наступлення заключаецца далей у тым, каб мабілізаваць максімум сродкаў на справу фінансавання нашай індустрыі, на справу фінансавання нашых саўгасаў і калгасаў.

Студзеньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б), вызначаючы асноўныя задачы народна-гаспадарчага плана на 1933 год, першы год другой пяцігодкі, абавязаў «усе партыйныя, совецкія і гаспадарчыя арганізацыі безумоўна забяспечыць: а) захаванне самай строгай бюджэтнай і крэдытнай дысцыпліны як па даходах, так і па расходах; б) цвёрдае правядзенне гаспадарчага разрахунка і дагаворнай дысцыпліны паміж гаспадарчымі органамі; в) недапушчэнне якога-б там ні было на-планавага будаўніцтва».

Падсумаваць вынікі за 9 месяцаў бягучага года, паказаць, што задачы, якія пастаўлены перад фінансавай сістэмай народна-гаспадарчым планам 1933 года ў сэнсе забеспячэння сродкамі гаспадарчых і соцыяльна-культурных мерапрыемстваў, з поспехам выконваюцца. Дзяржаўны бюджэт БССР, які з'яўляецца моцнай зброяй партыі і ўрада ў барацьбе за пасяховае выкананне народна-гаспадарчых задач, за 9 месяцаў выкананы па даходах у суме 188,4 млн. руб. ці на 78,7 проц. гадавога прызначэння і па расходах у суме 186,4 млн. руб. ці адпаведна на 77,9 проц.

Перспектывы выканання дзяржбюджэта ў 4-м квартале ўжо зараз даюць магчымасць сказаць, што апошні будзе выкананы поўнасцю. Вельмі таго, у чацвёртым квартале намячаецца накапленне дадатковага рэсурса для дзяржаўнага і мясцовага бюджэтаў БССР у суме 5 млн. руб.

Але пры назўнасці бясспрэчных поспехаў у выкананні фінансавай праграмы бягучага года, што з'яўляецца вынікам агульна-эканамічнага і сацыяльна-культурнага ўздыму БССР, далёка не выкарыстаны ўсе магчымасці для яшчэ больш высокіх тэмпаў соцыялістычнага накаплення.

У праграме соцыялістычных накаплення ў прамысловасці ёсць значны прарыў. Па прамысловасці Наркамлеспрама, з прычыны недавыканання заданняў па якасных паказальніках, мацнела недабор у прыбытках за 8 месяцаў звыш 6 млн. руб. Вытворчая праграма за першыя кварталы па лёкай прамысловасці выканана ўсяго на 84,8 проц. Асабліва недазваляючыя вынікі паказваюцца па зніжэнні сабекошта прадукцыі. За першы квартал замест зніжэння сабекошта на 1,78 проц. ёсць павялічэнне на 4,6 проц., за другі квартал павялічэнне на 2,78 проц. замест зніжэння на 3,87 проц. У лінеі мацнела павялічэнне на 6,6 проц., у жніўні — на 7,5 проц. замест зніжэння па плану процента квартала на 4,7 проц.

Па трох трэстах Наркамснаба (Белкмо, Белбродтрэст, Белмасламаграрыя) павышэнне сабекошта склала за першае паўгоддзе 3,7 проц., па металаграсэту Наркамцяжпрамла зніжэнне сабекошта склала за 8 месяцаў усяго 3,3 проц. супроць 9,6 проц. паводле плана. Па трэсту будматаўрыбла 1,1 проц. замест 28,8 проц. Недавыкананне плановых заданняў, асабліва па якасных паказальніках стварыла напружанае фінансавае становішча ў радзе гаспадарчых арганізацый (будматэрыялы, шклотрэст, скурытрэст і інш.).

Рашэнні студзеньскага аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК УсеКП(б) паказваюць, што «другая пяцігодка, калі яна хоча разлічваць на сур'ёзны поспех, павінна далучыць прыкладзіці лозунг не толькі будаўніцтва новых прадпрыемстваў і новай тэхнікі».

Далучы такія ўказанні, партыя ставрабавала далучыць ужор зрабіць «не на колькасны рост прадукцыі, а на павышэнне якасці прадукцыі і рост прадукцыйнасці працы ў прамысловасці. Не на пашырэнне пасеўных плошчаў, а на рост ураджайнасці ў земляробстве і палепшэнне якасці работы ў сельскай гаспадарцы».

Гэтыя ўказанні партыі не ўлічылі кіраўнікі гаспадарчыя. У радзе сельска-гаспадарчых трэстаў не ліквідавана бесгаспадарчасць, якая ў асобных выпадках мяжуе з яўным шкодніцтвам. Напрыклад, на пушчэ-трусагалоўчым трэсту камплектаванне дарослай пушнікі было выканана ўсяго на 23,4 проц. гадавога плана, трусоў на 31,3 проц. У выніку раскрадвання кармоў, дрэннага догляду, зрыва будаўніцтва, адыход па дарослых трусах дасягае 28,3 проц. і па маладняку — 54,8 проц. Адыход курапят складае 29 проц. На Менскаму маслакапрамтрэсту адыход маладняка жывёлы дасягае 19 проц., па Гомельскім — 20,2 проц. Толькі прыступленнем класавай пільнасці, прымірэнцтвам да класавага ворага, простым патурашчэнем шкодніцам з боку кіраўнікоў гэтых арганізацый можна вытлумачыць падобныя факты бесгаспадарчасці.

Асабліва нездавальняюча стаіць справа з укараненнем гаспадарчага разрахунка ў камунальнай гаспадарцы. З-за агідных бесгаспадарчасці ў радзе жакгаў шматых гарадоў камунальна-жыллёвая гаспадарка працаўшчодна мільёны рублёў. У Бабруйску на працягу некалькіх год не спагнаўлася плата за займаемае памяшканне і камунальныя паслугі з асоб, якія пастаянна працуюць у гасцініцах, чым нанесці бюджэту страт у суме звыш 25 тыс. руб.

Пераплаты на будаўніцтве, прынятыя вялікі размер у мінулым годзе, не ліквідаваны поўнасцю і ў гэтым годзе. Ліміты будаўніцтва ў значнай ступені не асвойваюцца. За 9 месяцаў па прамысловасці ліміты асвоены на 51,2 проц., па сельскай гаспадарцы — на 54,7 проц. да гадавога плана. Абсталяванне будаўніцтва гуты імя Домбаля выяўлена адсутнасць вытворчага капітарыста і работных чарнякоў. Будаўніцтва не мае ні гадавога, ні квартальнага фінансавага плана. У выніку гэтага будаўніцтва, адпетае для бягучага года на аднолькавую плану ў 600 тыс. руб., да верасня не пачыналася. Пабудова свінарніка ў саўгасе Смолні, Касцюковіцкага раёна, не пачыналася да апошняга часу з прычыны пачынальнага закупленага леса, між тым, як тры трактары, якія ёсць у саўгасе, амаль не скарыстоўваюцца.

Не дае патрэбнага перадома і якасць будаўнічых работ. На пабудове лабараторнага корпуса Акадэміі Навук неадазваляючая кладка сцен прыводзіла ў асобных месцах да выпадзення са сцен цэглы.

Транспарт па-ранейшаму застаецца вузкім месцам на будаўніцтве, з прычыны чаго ёсць значныя пераплаты на гужтранспарту. Не гледзячы на, зусім ясныя дырэктывы аб недапушчальнасці па-за планавага будаўніцтва, на заводзе імя Ланцуцкага ў Гомелі будуецца па-запланам сталоўка коштам у 498 тыс. руб. Сельска-гаспадарчым банкам выяўлены факты па-запланавага будаўніцтва ў саўгасе Чарнічы, Віцебскага раёна, а таксама факты скарыстання бюджэтных асігнаванняў капітальнага будаўніцтва на эксплуатацыйныя выдаткі (Махаўская МТС, саўгас «Х-гіганцкі», Любавьскага раёна і г. д.). На Менскай кушнерскай фабрыцы ў капітальнае будаўніцтва ўкладаліся аварытныя сродкі. Устаноўлен рад фактаў спроб простай спекуляцыі будматэрыяламі.

Не гледзячы на жорсткія дырэктывы партыі і ўрада аб захаванні бюджэтна-фінансавай дысцыпліны і рэжыма эканоміі ў выдаткаванні сродкаў і фондаў зарплаты, ёсць факты грубага парушэння гэтых дырэктыў і простага злачынства разбазарвання і крадзяжу дзяржаўных сродкаў. Адным з яркіх прыкладаў гэтага з'яўляецца справа работнікаў Пятрыкоўскага раёна, якой не даўна прышлося заняцца дырэктыўным органам і пракуратуры. На чале разбазарвання дзяржаўных сродкаў апынуўся былы старшыня Пятрыкоўскага райвыканкома **Мацкевіч** і загадчык райфа **Грунецкі.**

Факты грубага ігнаравання бюджэтна-фінансавай дысцыпліны і разбазарвання дзяржаўных сродкаў выяўлены таксама і ў **Буда-Кашалёўскім** раёне. Характэрнае ў гэтых раёнах тое, што побач з разбазарваннем і яўнымі растратамі дзяржаўных сродкаў не выплачваліся зарплата настаўніцтву на 2-3 месяцы. Сарвана своечасовае фінансаванне важнейшых гаспадарча - культурных мерапрыемстваў. Усё гэта магло згарышы у выніку паказаўшай сямейнасці і разлажэння пасобных работнікаў раённага апарата.

Парушэнне бюджэтна-фінансавай дысцыпліны ў выдаткаванні фондаў зарплаты і адміністрацыйна-гаўчых расходу, асабліва на гаспадарчых арганізацыях, пры простым попусцельстве сямёх фінансавых і крэдытных органаў мае месца не толькі ў радах. На прамысловасці Наркамлесправа пры выкананні 8-месячнага плана па вырабу прадукцыі на 35,4 проц., фонды зарплаты выдаткаваны на 92,7 проц. На маргарынавай прамысловасці Наркамснаба гулына-заводскія выдаткі павялічыліся ў бягучым годзе на 23,8 проц., а пахавыя на 23 проц. супроць мінулага года. Па віцебскаму малпрамтрэсту паўтадаўны фонд зарплаты перавыдаткаваны на 42 тыс. руб. Фонды зарплаты і ліміты адміністрацыйна - гаспадарчых расходу за лік іншых выдаткаў парушаюцца і асобнымі бюджэтнымі ўстановамі (былы бухінстытут, сельска - гаспадарчы інстытут у Горках і інш.).

Тав. Ленін гаварыў: «Калі мы захаваем за рабочым класам кіраўніцтва над сялянствам, дык мы атрымаем магчымасць цэлай найвялікшай эканоміі гаспадарай у ранай дзяржаве дабіцца таго, каб усякае малейшае зберажэнне заставаць для развіцця нашай буйнай машыннай індустрыі, для развіцця электрыфікацыі, торфа, для пабудовы Волкажбудаў і інш.

Цучы па шляху, указанаму т. Леніным, патрабавалася «ўсталяваць самы строгі рэжым эканоміі і накапліць сродкі, патрэбныя для фінансавання індустрыялізацыі нашай краіны... каб дабіцца адбудавання цяжкай індустрыі і ажыццяўлення пяцігадовага плана».

На жаль, гэтага не разумеюць або не хочуць лічыцца з гэтым пасобныя гаспадарскі і фінансавыя работнікі, пастаўленыя партыяй на адказнейшых участках соцыялістычнага будаўніцтва. Чым-ка іншым можна тлумачыць такія факты, калі па Белметалатрэсту, белторфтрэсту, белбудматэрыялу дэбіторская запазычанасць дасягнула на 1 верасня т. г. 1,2 млн. руб.? На сельска-гаспадарчых трэстах, асабліва па Гомельскім і Віцебскім малпрамтрэстах, дэбіторская запазычанасць прымае зацяжныя і направалочы характар.

Рабочыя і працоўныя масы Совецкай Беларусі пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б дабіліся велізарных перамог на фронце мабілізацыі сродкаў насельніцтва. Але і ў даным пытанні ёсць недахопы.

Дрэнна справа ў сэнсе якаснага выканання плана, асабліва па добраахвотных платежах — укладах у ашчадкасы, рэалізацыі пазык на ёсць, у першую чаргу, сярод адпаведнікаў.

Побач з яўным патурашчэнем кулаку, злосному эрэдэчыку скубы, дзяржаўных заданняў, спекулянтам, разам з яўменнем выявіць кулака і

Заводы і фабрыкі сустракаюць Кастрычнік з перамогамі
Сцяг пяршынства нясуць лепшыя з лепшых

З ЧЫМ МЫ ПАДЫХОДЗІМ ДА ФІНІША ПЕРАКЛІЧКІ

У часе ўключэння ў перадкастрычніцкую пытворчую пераклічку нашамолодзевая брыгада імя Першага мая фанернага завода «Звязда» (Віцебск) са мабілізавалася суступць кастрычніцкі спаты з лепшымі показчыкамі ў нашанальнай прамфінплана.

Дзенне нашы слова мы спрывілі. Сустрэлем XVI-ю гадавіну Кастрычніка з новымі перамогамі на фронце соцыялістычнага будаўніцтва.

Наша брыгада з 5 чалавек (выключна ад моладзь) абслугоўвае лучшынны варштат «Роллер», які вытрацоўвае экспортную фанеру. Свае штодзённую цэлаграму выкоўваем на 120 і больш процантаў. Паводле плана мы павінны штодзённа вытрацоўваць 7,24 кб. мтр. фанеры. Мы-ж даем 8—8-5, а часамі і 9 кб. мтр.

Не паслабляючы тэмпаў, мы цэнтральную нашу ўвагу звяртаем на якасць. Даем фанеру найвышэйшай якасці. У нашай прадукцыі вы не сустрэнеце ні моманта драннага луччэ, ні шарахавасці. За час нашай работы на гэтым працэсе (7 месяцаў) не было ніводнага выпадка, каб нашу фанеру забракавалі.

Як-жа мы дабіліся такіх поспехаў у сваёй рабоце.

Перш-наперш з сябе. Працаваў я раней дрэнна. Дзеўку нямала бракованай прадукцыі. Тлумачылася гэта тым, што я быў тэхнічна неінтэлігентным. І вось, калі на заводзе арганізаваліся курсы па вывучэнні тэхнімінімума, я даў сабе слова ва што-б там ні стала аўладаць тэхнікай вытворчасці. У гэты час на заводзе устанаўліўся замежны лучшынны варштат (навейшай замежнай тэхнікі, сістэмы «Роллер». Наведваючы курсы, я адначасова сачыў за яго устаноўкай, вывучаў яго механізм. Усю пры вдачы экзамена я ведаў варштат, як свае пяць пальцаў. З 15 чэрвеня разам з 5-ю маладзёжнымі таварышамі пачаў на гэтым варштаце працаваць.

Кожны тыдзень, як правіла, мы правяртаем вытворчыя нарады, дзе канкрэтна выразнаем пытанні па палепшэнні якасці прадукцыі і павялічэння колькасці. На адной з нарад мы пастанавілі скараціць колькасць нашай брыгады з 6-ці чалавек да 5-ці, што і было зроблена. На нарадзе ад 24 кастрычніка мы зноў пастанавілі хадайнічаць перад адміністрацыяй, каб з першага лістапада нам павялічылі норму вырабоўкі на 25 процантаў і перавялі наш варштат на поўны гаспрэхрахунак.

За ўвесь час нашай работы не было ніводнага выпадка палому інструмента, яко асобных механізмаў. Да пачатку работы, у часе работы і абедзенага перапынку мы ў абавязковым парадку замазваем варштат і пасля работы чысцім яго. Адным словам, другой змене здаем варштат ва ўзорным парадку.

Адпойчы я прымоўіў, што гук варштата яні-та падазроны. Зараз-жа я яго спынёў. Пры дэтальным яго агляндзе я выявіў, што матор узяліўся ў бок ад фундамента, з-за чаго атрымалася слабае счапленне шасцярэнь. Гэты дэфект тут-жа быў выпраўлен. Калі-б я гэта ніо выявіў, то варштат абавязкова на поўны час выйшаў-бы са строя.

Працоўная дысцыпліна ў нашай брыгадзе знаходзіцца на належнай вышыні. Мы не ведаем ні прагулаў, ні спазненняў на работу. За ўвесь час нашай работы мы не маем ніводнага дысцыплінарнага спагнання.

Рабочы дзень у нас поўнасцю ўпчыльнен. Я, як брыгадзір, заўсёды прыходжу на работу раней за ўсіх. Падрыхтоўваю змазачны матэрыял, інструменты, устанаўліваю нож і правяраю агляд варштата. У результаце рабочы дзень у нас праходзіць без усякіх перабояў. Працуем поўнасцю 420 мінут.

У нашай рабоце мы ўжываем метады соцыялістычнага спаборніцтва і прамадскага кантроля. Наша брыгада ўвесь час спаборнічала з брыгадай **Баброва**, якая працуе на 4-м варштаце. Асабіста я ўзяў над таварышам Бабровым шэфства. На працягу 3-х тыдняў я штодзённа заставаўся пасля работы на гадзіну, дапамагаў яму ўстанаўліваць нож, показваў, як трэба абыходзіцца з асобнымі часткамі варштата.

Усе рабочыя нашай брыгады т. т. **Навумовіч, Шпакаў, Коршукова і Крыцкая** зарэкамендавалі ўдарнікамі. За такую ўдарную работу нядаўна на канферэнцыі моладзі па якасці нас прамійравалі 200 рублёвай. Асабіста я яшчэ да гэтага не раз прэмяраваўся. Як лепшага ўдарніка, мяне зараз абралі дэлегатам на гарадзкі зьезд ударнікаў па якасці. Наша брыгада таксама заваявала пераходны сцяг заўкома і заводаўпраўлення.

З такімі показчыкамі мы сустракаем вялікі Кастрычнік, г прыходзім да фінішу пераклічкі. У дагэтым абяцаем пашы поспехі яшчэ больш замацаваць, абяцаем быць заўсёды ў перадавых радах барацьбітоў за тэмпы і якасць.

Брыгадзір моладзьнай брыгады імя Першага мая КОЦІК АРОН.

ПОСПЕХІ ЗАЛЕЖАЦЬ АД НАС

Фабрыка **«Прафінтэрн»** за першае паўгоддзе прамфінплан выканала ўсяго на **82,8 проц.** Глыбокі прарыў быў па ўсіх показчыках і асабліва па якасных. Вытворны брак складаў **4,53** проц. Запасы незакончанай прадукцыі ў цэхах дасягнулі да **20** тыс. адзінак. Ваза сацыялістычнага накладала на фабрыку пітрафы і ўцэнкі за недобраякасную прадукцыю.

Прычына заключаліся ў тым, што пастаноўка работы ў цэхах не давала магчымасці весці канкрэтную барацьбу з бракам і бракаробамі. Работу адной змены правяраюць другая змена, што адбіваецца на якасці пашыўні і выкананні вытворчай праграмы.

7-га чэрвеня г. г. ЦК КП(б)Б, разглядзеўшы пытанні аб рабоце фабрыкі, падкрэсліў, што далейшы прарыў у выкананні прамфінплана фабрыкі ЦК будзе расцэньваць выключна, як няўмоўнае партыйна-гаспадарчае і прафсаюзнае кіраўніцтва па-большэвіцку працаваць і абавязала партарганізацыю завода і кіраўніцтва карэнным чынам перабудаваць работу.

У трэцім квартале фабрычныя арганізацыі прыступілі да перабудовы сістэмы работы. У першую чаргу вопыт перабудовы работы быў праведзен цэху па пашыўцы суконнага абмундзіравання.

Новая сістэма, як вядомая, у тым, што цэх быў разбіты на 6 самастойных гаспадарча-разлікуючых істужак з закончанымі працэсамі вытворчасці, пры [illegible] аперацыях. Акрамя таго, былі ўведзены новыя аперацыі для поўнага забеспячэння добраякаснай пашыўкі.

Гэтым самым былі ліквідаваны абязлічка. Для барацьбы з бракам былі ўведзены старэйшыя майстры, на якіх была ўскладзена адказнасць за поўнае выкананне плана і кантроль за якасцю працоўных. Пасады рэнейшых кантралёраў, якія сабе не апраўдалі, былі ліквідаваны. Пры новай сістэме ўстаноўлен парадак, пры якім кожная істужка да канца праводзіць сваю работу, не перадаючы паўфабрыкат другой змене. Гэта дала магчымасць хутка выяўляць вінаватых за брак і весці рашучую барацьбу з бракаробамі.

Вынікі перабудовы работы аказаліся сільнымі хутка. Якасць прадукцыі значна палепшылася з першых-жа дзён. Калі ў лінеі брак дасягаў **14** проц., дзе у заняцці—**0,86**, а ў вечарнай—**0,3** проц., г. зн. ніжэй процента, дапускаемага на лінію.

Атрымаўшы такі эфект у адным з цэхаў, у пачатку чацвертага квартала фабрыка перанала на самастойныя гаспадарча-разлікуючыя істужкі ў [illegible] цэхі.

Перабудова работы фабрыкі з першых-жа дзён дала розвае зніжэнне брака і з высокага поўнае выкананне вытворчай праграмы. На цэху пашыву, які [illegible] час знаходзіўся ў прарыве, за 20 дзён кастрычніка прарыў змагі ліквідаваны цалкам. За гэты час цэх выканаў прамфінплан на **97** проц. Недавыкананне плана адбылося з прычыны адсутнасці электраэнергіі, з-за пашкоджаных пратэзаў. Пасля 20-га цэх пайшоў уверх. Так, 22 кастрычніка прамфінплан цэхам выкананы ўжо на **105,8** проц., за 24-е — на **110,3** проц., і за кастрычніка — на **107,2** проц. За гэты час змагі не было ніводнага выпадка ўцэнак або штрафаў з боку саюза ніводбыта за недобраякасную прадукцыю.

Трэба адзначыць, што асобныя істужкі, як, напрыклад, № 10, т. т. **Самуйлаў, Брэнер, № 13—Загарацкі, № 14—Шнейдарман, № 6—Фурман, № 9 — Буракоў, № 3—Лапко** даюць лепшыя показчыкі па поўным выкананні плана, па якасці прадукцыі.

Гэтыя істужкі штодзённа перавыконваюць свой прамфінплан. Лепшымі ўдарнікамі з'яўляюцца **Калінін, Цітова, Маневіч, Федаровіч, Галовіч, Клімановіч, Гентман, Кінельман** і прыёмшчыкі **Літвін і Сёмчанка.**

Адначасова з гэтымі асобнымі істужкі пры тых-жа ўмовах не выкананы вы

творчай праграмы. Істужка № 5—**Беланожкін, Кацаў, № 16—Каган, Гошнір, № 1—Дворкін, Белкін, № 7—Смагрон, Мамантава, здалі тэмпы.** Парушэльнікі і бракаробамі з'яўляюцца **Палозава, Плюшкіна** і прыёмшчык **Спасадзінскі.**

На фабрыцы выкананне пазыка за аўладанне тэхнікай, за якасць. Правам на атрыманне гэтай пазыкі карыстаецца той, хто не працуе, а запрымлівае пераробкі і брак. Аўтарам гэтага мерапрыемства, з'яўляецца работы цэха пальто—**Капэлін.** З увядзеннем пазыкі таксама значна паменшыліся колькасць пераробак і брака.

Лепшымі змагарамі за выкананне брака і пераробак, а таксама за недапушчэнне бракаванай прадукцыі з'яўляюцца **Дворкін**—дзіцячы пальто, **Кара і Ягорава** — бручны цэх. Яны ўжо атрымалі абяцаньні.

На фабрыцы арганізавана 5 гурткоў па аўладанні тэхнікай. Гэтымі гурткамі ахоплена 51 чал. Праведзен тэхбой у тэхнасцы і цэху па пашыўцы пітаноў, які з'яўлся лепшым метадам тэхвучобы і правэркі аўладання тэхнікай работы.

На фабрыцы шырока разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва. Праводзіцца праверка соцдагавораў, а таксама заключаюцца новыя дагаворы, нашэ істужкамі і індывідуальныя дагаворы нашэ асобнымі рабочымі. Зараз на фабрыцы маецца 29 групавых дагавораў з **784** індывідуальнымі. Шырока разгорнута праца па пэфэтыву старых кваліфікаваных рабочых над новымі. Усяго пэфэтыве 44 чал. Ударніцкі ахоплена **955** рабочых. Асобна спаборнічаюць нашэ сабой старэйшыя майстры па істужках т. т. **Фурман, Пляскін, Ігольнікаў і Мамантава.**

Падыходзячы да XVI гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, фабрыка пачала змагацца за яшчэ лепшыя показчыкі плана з тым, каб заваяваць першае месца ў калонах дэманстрацыі XVI гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Брыгада: Ратнін, Курноў, Хэруза, Кулкін, Зігельбаўм.

Гонар першай пяцігодкі

Святкаванне XVI-гадавіны Кастрычніка на паўночнай фабрыцы супадае з 3-гадовым з дня яе адкрыцця.

Шаўковая фабрыка мае выгляд сапраўднага і індустрыяльнага камбіната. Увесь цэх поўнасцю ў эксплаатацыю ЦЭЦ, пушчан турбагенератар, чым падвядзена грунтоўная ўласная энергетычная база. У гэтым годзе бу-же набудзеван серавутольны завод, электрыфікаваны тарфяны гробенаўскі завод і праведзен яшчэ рад іншых капітальных работ.

Калі ў першы год сваёй работы фабрыка выканала свой прамфінплан на **78,5** проц., у другі—на **82,5** проц., то за тры кварталы 1933 года выкананне прамфінплана складае **106,4** проц. задання і на якасных показальніках—**107,3** проц.

За тры гады свайго існавання фабрыка выпусціла прадукцыі на **54,2** мільёна рублёў, з іх у 1933 годзе дана прадукцыі на **32** мільёны рублёў.

На працягу ўсіх трох кварталаў 1933 года фабрыка штодзённа перавыконвае свой прамфінплан. Захест 4 тыс. кгр. шоўку фабрыка выпускае **4.500—5.000** кгр. кожны дзень.

З года ў год павялічваецца выпуск першага гатунка прадукцыі. У 1933 годзе шоўку першага гатунку выпушчана будзе, ў тры разы больш, чым у 1932 годзе.

Адпаведна росту прадукцыйнасці працы павялічваецца заработная плата рабочых. У 1932 годзе павялічана на **27** проц. у параўнанні з **1931** годам. У 1933 годзе зарплата вырасла на 36 проц.

За апошні час расселены ў жылых дамах 1 тыс. рабочых і ІТР фабрыкі. Пабудавана новая сталоўка для рабочых, капчаецца будаўніцтва новага дома на 56 кватэр. У культурна-бытавое будаўніцтва на 1933 год укладзена поўнымі рублёў.

Усе гэтыя перамогі з'яўляюцца вынікам большэвіцкіх метадаў працы пад кіраўніцтвам партыі. (Белта).

100 камандзіраў сярэдняга звяна

Пад непасрэдным кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, на аснове соцспаборніцтва і ўдарніцтва Беларускі дзяржаўны тэхнікум швейна-тэкстыльнай прамысловасці выпускае першых 100 тэхнікаў-тэхнолагаў.

100 камандзіраў соцыялістычнай прамысловасці ўліваюцца ў рады барацьбітоў за выкананне прамфінплана, за ліквідацыю прарыва, за добрую якасную працоўную на нашых тэкстыльных прадпрыемствах.

Выпускнікі паходзяць у сваім складзе **65** проц. рабочых і іх дзяцей, 8 проц. калгаснікаў і г. д.

7 проц. членаў і кандыдатаў КП(б)Б, 79 проц. членаў ЛКСМБ.

Якасныя показальнікі выканання навучальнага плана: вельмі добра—**27** проц., добра—**41** проц., задавальняюча—**32** проц.—з'яўляюцца яркім прыкладам роста акадэмічнай касныхо васці студэнцтва і паляпшэння педагагічнага працэса.

Выпускнікі накіроўваюцца на работу ў кіязвыя звенні прадпрыемства. Кожны з іх павінен на сваім участку стаць на чале барацьбы мас за асваенне тэхнікі вытворчасці, укараненне тэхнічных ведаў у шырокія колы рабочых, за выкананне прамфінплана.

Дырэктар ШВЗР.

Магутнасць абутковай фабрыкі павялічваецца ў тры разы

На абутковай фабрыцы імя **Кагановіча** (Менск) за дні святкавання XVI-цігоддзя Кастрычніка закладваецца фундамант новага штамповачнага цэха.

З увядзеннем у строй штамповачнага цэха вытворчая магутнасць фабрыкі павялічваецца амаль у тры разы. У 1933 годзе фабрыка навіна даць **4.700** пар абутку, пры набудове-ж новага цэха яна будзе выпускаць **12 тыс.** пар абутку.

Кошт будаўніцтва аднаго толькі корпуса штамповачнага цэха складае **293 тыс. руб.**

Аграча гэтага на фабрыцы заканчваюцца работы на набудове новай кацельнай, дзе ўстаноўлены будуць два катлы ў 800 кв. метраў нагрэва.

(БЕЛТА).

ЦК КП(б)Б, СНК БССР, газеце „Звязда"

Гомельскі порт мае ўсесаюзнае значэнне і з'яўляецца першым рэчным портам у СССР. Ужо скончаны работы першай чаргі Гомельскага порта, прыбыла яніх праведзена. Прычальныя лініі і склады ўжо ўступілі ў строй. 1 лістапада порт здан у эксплаатацыю. На тэрыторыі порта пабудаваны элеватары ўмяшчэннем у паўтара мільёна пудоў збожжа, тарны склад, млын і рад іншых складоў. Гэтыя прадпрыемствы працуюць поўным ходам. Работы па далейшаму будаўніцтву порта праводзяцца.

БЕЛВОДБУД МАМАРЗНКА.
ПАРТОРГ ШПАК.

10 лістапада—пуск Гомельскага шклозавода

Паводле пастановы СНК БССР УРАЧЫСТЫ ПУСК НОВАГА ГОМЕЛЬСКАГА ШКЛОЗАВОДА Ў КАСЦЮКОЎЦЫ АДБУДЗЕЦЦА 10 ЛІСТАПАДА.

На ўрачыстае адкрыццё завода запрошаны наркамлёгпрам Саюза тав. ЛЮБІМАЎ і намеснік наркамлёгпрама тав. ЛЕВІН.

Для ўрачыстага пуска завода створана ўрадавая камісія ў складзе т. т.: ЖЭБРОЎСКАГА, БАЛЦІНА, КАВАЛЬЧУКА, КАЦА, ШАФАРЭНКА і РАЧЫЦКАГА.

7 вагонаў звыш плана

Вагонарэмонтны завод імя **Мяснікова** ў Менску сустракае XVI гадавіну Кастрычніка перавыкананнем вытворчай праграмы за кастрычнік. За дадзе рэвалюцыі на **111 проц. Выпушчана з рамонта звыш плана 7 вагонаў лішнікаў.**

У парадку падрыхтоўкі да свята на заводзе праведзена вытворчая канферэнцыя па ўпчыльненню рабочага дня.

У выніку разгорнутага конкурса на лепшую ўдарную брыгаду імя XVI гадавіны Кастрычніка лік ударнікаў павялічыўся на 25 проц. Перагонцамі ў конкурсе з'яўляюцца брыгада **Гадашэвіча**, выканаўная план на 133 проц., **Падабеда**—на 166 проц. і **Шпілеўскага**—на 135 проц.

Пасігадзел раёна даў ладны трыкушніку завода Мяснікова ў дзень XVI гадавіны Кастрычніка рапартаваць аб сваіх перагонах сакратару ЦК УсеКП(б) тав. **Кагановічу**, начальніку наркамтяжпрама НКПС тав. **Паленскаму** і начальніку пасігадзела МБВ тыгуцкі тав. **Дяненка** (Белта).

АБ ЧЫМ СІГНАЛІЗУЕ СЛАУНАЎСКАЯ СПРАВА

Рабочыя, калгаснікі і ўсе працоўныя Совецкага саюза пад непасрэдным кіраўніцтвам ленінскай партыі пераможна будуюць соцыялізм у нашай краіне. Пасяхова выкананы планы першай пяцігодкі, ідзе ўпартая барацьба за план першага года другой пяцігодкі, за пабудову бясклассавага соцыялістычнага грамадства ў нашым Саюзе.

Усё гэта — результат правільнага ажыццяўлення генеральнай лініі партыі і ленінскай нацыянальнай палітыкі, результат няўхільнай барацьбы супроць класавага ворага і яго агентуры — апартуністаў усіх колераў і адценняў.

Але класавы вораг яшчэ не дабіт. Раз прамленае кулацтва і яго агентура «цілхай сапаі» школоць соцыялістычнаму будаўніцтву. Класавы вораг асабліва варае імкнецца затармазіць наш рост, прыпыніць наша пасяховае соцыялістычнае будаўніцтва. І таму барацьба з класавым ворагам, барацьба супроць розных адхіленняў ад генеральнай лініі партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку, за масавае інтэрнацыянальнае выхаванне шырокіх працоўных мас патрабуе максімальнага напружання сіл. Трэба ўмець бачыць ворага, выкрываць яго контр-рэвалюцыйныя справы, змяталь яго з нашага шляху.

У Талачынскім-жа раёне гэтага няма. Многія кіраўнікі партыйных ячэек, кіраўнікі асобных звеншаў соцыялістычнага будаўніцтва не вядуць пікай барацьбы з класавым ворагам, не вядуць барацьбы з рознымі адхіленнямі ад генеральнай лініі партыі, не змагаюцца за ўмацаванне совецкіх школ, за інтэрнацыянальнае выхаванне ў комуністычным напрамку працоўных мас і асабліва дзетвары.

Контр-рэвалюцыйныя, нацдэмаўскія, шавіністычныя і антысеміцкія элементы ў Талачынскім раёне арудавалі і арудуюць без усякіх перашкод. За апошні год на раёну контр-рэвалюцыйныя элементы асабліва актывізаліся ў антысеміцкіх вылазках. Талачынскі РК КП(б)Б увесь час быў у баку, зусім не цікавіўся «дробнымі» фактамі антысемітызма, не рабіў для сябе адпаведных высноваў. Інтэрнацыянальна-выхаваўчая работа ў раёне ляўна інтэрпрэцыя і па сёнешні дзень.

Становішча інтэрнацыянальнага выхавання ў раёне асабліва ярка характарызуе **слаўнаўская** справа. Там контр-рэвалюцыйныя элементы ад «дробных» і замаскаваных фактаў антысемітызма перайшлі да арганізацыі адкрытага пагрома яўрэйскай школы. 14 кастрычніка вучні Слаўнаўскай беларускай чыгуначнай ФЗС **Кулік Мікола, Дуброўскі, Віталі, Коэік Генэ, Позняк Уладзімер, Федарнова Надзя, Позняк Сяргей і Позняк Лявон** зрабілі налёт на Слаўнаўскую яўрэйскую школу. Пабілі шыбы, узламалі дзверы і пачалі граміць усю маемасць школы. Вынеслі на двор усе кнігі, беларускія забралі сабе, а яўрэйскія спалілі. Пабілі і паламалі сталярныя інструменты. Парваўшы насценгазету, перад адыходам з будынка гэта група, нанятая контр-рэвалюцыйнымі элементамі, расклеіла на сценах і лавах розныя антысеміцкія лозунгі.

А загадчык Слаўнаўскай ФЗС т. **Каждан**, настаўнікі **Сучко, Казямякіна, Меер, Галубоўская** і інш., сакратар чыгуначнай парт'ячэйкі аб гэтым «не ведалі» да 19 кастрычніка.

Загадчык ФЗС тав. Каждан 19 кастрычніка вывесіў загад: **«Вучні Слаўнаўскай ФЗС залезлі ў памяшканне яўрэйскай школы... раскрадлі кнігі... панадпісвалі розныя пахабныя словы на сценах школы... Расцэньваючы гэты факт як яўна хуліганскі-антысеміцкі... выключыць з Слаўнаўскай ФЗС на адзін год наступных вучняў...»**

Совет пінэрскай базы на чале з комсамолкай **Зуевай** склікае па-зачарговае пасяджэнне. На парадку дня стаяцца такія пытанні: «1) **аб дэкадніку штурма, 2) аб праяўленні антысемітызма з боку вучняў, 3) аб падрыхтоўцы да 16-й гадавіны Кастрычніка».** Па другім пытанні прымаецца наступная пастанова: «Заслухаўшы інфармацыю аб праяўленні антысемітызма... совет бярэ на сябе абавязкі: 1) весці сярод пінэраў інтэрнацыянальнае выхаванне шляхам правядзення вечароў, раніпікаў; 2) весці растлумачальную работу сярод яўрэяў у школе» і г. д. Такія-ж палітычна-бліжаруюся пастановы былі прынятыя на групавых сходах школы, а таксама і ячэйкай ЛКСМБ (сакратар — комуніст **Каган**).

А партыйная ячэйка гэтым пытаннем нават не зацікавілася. Горш таго, сакратар ячэйкі тав. **Быхаўцоў** заявіў: **«Парт ячэйка ўсякай школьнай чапухі разбіраць не будзе».**

Старшыня Слаўнаўскага сельсовета тав. **Грышэль** таксама лічыць сябе тут ні пры чым: **«Я-ж яўрэйскай школе ўжо даў лепшае памяшканне, чаго-ж яны больш хочуць ад мяне?»** — гаворыць ён.

Пазней выявілася, што бацькі дзі-

цей, якія зрабілі напад, з цёмным мінулым, што Дуброўскі — сын кулака, **Коэік Генэ** — сын вядомага злодзея, **Федарнова Надзя** — дачка буйнага спекулянта. Бацькі ўсіх гэтых дзяцей зараз працуюць на чыгунцы. Здаецца, што МК станцыі Слаўнае павінен быў завяцца гэтым пытаннем. Кулакі, спекулянты разам з іншымі контр-рэвалюцыйнымі элементамі свядома накіроўвалі сваіх дзяцей на разгром яўрэйскай школы. А старшыня МК тав. **Позняк А.** лічыць зусім непатрэбным займацца гэтай справай.

Хто-ж працуе настаўнікамі ў Слаўнаўскай ФЗС? **Цыбулькін** — сын кулака, **Кажамякіна** — дачка попа, **Панючыц** — былы дырэктар імназіі, **Сучко** — былы эсэр.

Як і чаму яны навучаюць дзяцей? Вось узяць хоць-бы таго-ж самога Панючыца. На пытанні вучняў, што такое МТС, што такое цяжкая індустрыя і інш., ён адказвае: **«МТС гэта тое месца, дзе сталь машыны, цяжкая індустрыя называецца таму, што яе цяжка будаваць».**

А хто такі загадчык ФЗС т. Каждан? Соцыяльнае паходжанне яго не зусім ясное. У Слаўным многія сцвярджаюць, што яго матка, булучы прыватнай прачкай, трымала па 10-15 чалавек паймовай сілы, трымала і эксплуатавала вучняў і г. д.

Настаўнікі-чукакі — арганізатары нападу на яўрэйскую школу. Аб гэтым сведчыць новы антысеміцкі факт. 3-га лістапада настаўніца Флярэнка і інш. на ўсіх грачах правялі «тутарскі» з вучнямі. **«За антысеміцкія ўчынкі ў нашай школе, — гаварылі яны вучням, — нас, мабыць, будуць знімаць з работы. Вы пратэстуйце, арганізуйце забастоўку. Скажыце, што з іншымі настаўнікамі не будзем займацца».**

На вагах Талачынскага РК КП(б)Б пад кіраўніцтвам загадчыка райАНА тав. **Ушакова** класава-чужыя элементы ў настаўніцкіх радах разлагаюць совецкую школу, выхоўваюць дзяцей у антысовецкім духу. Загадчык райАНА зараз усхамянуўся. Ён выдаў загад: **«Зняць з работы настаўніцу Кажамякіну і настаўніцу Сучко, перавесці ў другую школу яе мужа настаўніка Сучко, загадчыку ФЗС Каждану... абвясціць суровую вымову...»** У гэтым ліку дзіваўтай аказалася і загалічыца Слаўнаўскай яўрэйскай школы тав. **Фейгіна. Ушакоў** разам з мясцкомам саюза працаўсветы настаяў зняць яе з работы за тое, што яна **«спабе запёрла дзверы школы, што не зачыніта шафу, у выніку чаго ўсё гэта паспужыла пасадам для разгрома яўрэйскай школы».**

Нельга не адзначыць і таго, што 19 кастрычніка ў Слаўным былі прадстаўнікі РК КП(б)Б — **Сямёнаў** (агітмас), **Мельнікаў** (культпрап) і часовы рэдактар): Яны літаральна не прынялі ніякіх мер, каб ачысціць слаўнаўскую ФЗС ад чужакоў, каб паставіць пытанне на бюро РК аб такім ганебным факце антысемітызма. Бюро райкома ў цэлым не ўлічыла небяспекі дадзенай справы, яно занялося гэтым пытаннем толькі 25 кастрычніка.

Сакратар РК КП(б)Б тав. **Сюся** гэты контр-рэвалюцыйны факт расцэньвае зусім правільна. Ён гаворыць:

— Слаўнаўская справа з'яўляецца ў Талачынскім раёне не першым фактам. Усё гэта гаворыць за тое, што чыстка партыйнай арганізацыі ў нас у раёне змазана, што ад камісіі на чыстку ўтоена ўся гніль, укрыты перараджэнцы.

І гэта зусім правільна. Бывае кіраўніцтва РК КП(б)Б (сакратар Сляпін) яме пеі месяц таму назад) змазала праявленне чыстки, не дапамагло камісіі па чыстцы выявіць усю гніль у талачынскай парторганізацыі. Факты з Слаўнаўта, факты з цэлага раду іншых сельсоветаў Талачынчыны патрабуюць паўторнай чысткі для асобных ячэек Талачынскага раёна.

Талачынская комсамольская арганізацыя працуе вельмі слаба. Кіраўнікі талачынскай комсамольскай арганізацыі, асабліва ў раённым цэнтры, страцілі сваю класавую пільнасць. Райком комсамола на чале з сакратаром **Сакалоўскім** работай школ, інтэрнацыянальным выхаванням комсамольцаў і пінэраў не займаўся і не займаецца.

Слаўнаўская справа з'яўляецца сур'ёзным сігналам аб засмечанасці настаўніцкага складу і многіх школах класава-чужымі элементамі, аб зусім слабай рабоце ў школе па інтэрнацыянальным выхаванні дзяцей, аб скарыстанні гэтай слабасці класавым ворагам.

В. СТАЛЬНОЎ.

Слаўнае, Талачынскага раёна.

Аб складзе ячэйковых камісій па чыстцы менпартарганізацыі

Пастанова гарадской камісіі па чыстцы КП(б)Б

Назначыць ячэйковую камісію па чыстцы ячэйкі Акадэміі Навук Беларусі ў наступным складзе:

Старшыня—ПЫЖЫКАЎ В. С., член партыі з 1918 г., рабочы, загадчык агітмасавым аддзелам ЦК КП(б)Б.

Члены: АГОЛ Г. І., член партыі з 1917 года, работніца, старш. ЦП саюза гарадскіх прадпрыемстваў.

Балакін Я. І., член партыі з 1919 г., рабочы, работнік Упаўнаркамсаўгасаў.

Аб зменах у складзе ячэйковых камісій па чыстцы КП(б)Б

Пастанова менскай гарадской камісіі па чыстцы КП(б)Б

Тав. РУБІНА І. С. аслабаніць ад абавязкаў члена ячэйковай камісіі па чыстцы партячэек Упаўнаркамлеса і Лесбела. Замест тав. Рубіна членам ячэйковай камісіі назначыць тав. РАБЫШКА І. М., член партыі з 1919 г., рабочы, інспектар па снабжэнню Упаў наркамсаўгасаў.

У сувязі з адкліканнем на непасрэдную работу, аслабаніць т. т. ЛЕВІНУ і СПАЛІНСКАГА ад абавязкаў членаў ячэйковых камісій.

Замест іх членамі ячэйковых камісій па чыстцы назначыць т. т. ЛОЖКІНА С. І., члена партыі з 1918 г., рабочы дырэктар Рыбабыта і тав. ГУРЗВІЧА А. Я., член партыі з 1925 г., рабочы завода «Большэвік».

МЕНСКАЯ ГАРАДСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

Марынуюць скаргі працоўных

(ЛІСТ РАБОЧАГА).

Пры Рагачоўскім райса, як і ва ўсіх раёнах, створана раённая камісія па разгляду скарг аб выключэнні з калгасаў. Але-ж на жаль, гэтая камісія на чале з тав. **Яўтушковым** існуе толькі фармальна. У камісіі ляжаць нерагледжанымі дзесяткі скарг выключаных з калгасаў, пастуліўных ад розных цэнтральных арганізацый (НКЗ, рэдакцый газет і інш.). Марынаванне скарг працоўных у Рагачоўскім раёна ўвайшло ў сістэму. Тут ляжаць на месце і больш месяцаў не толькі заявы аб неправільным выключэнні з калгасаў, але і рад іншых заяў ад калгаснікаў і працоўных адпасобнікаў раёна. На запытанне, чаму так доўга марынуюцца заявы — тав. Яўтушкоў адказаў: «не збіраюцца члены камісіі на пасяджэнне». Член камісіі тав. **Гельфер** упэўнена заяўляе, што Яўтушкоў ужо паўгода як не склікаў пасяджэння камісіі. Райса да гэтага часу не мае чалавека, адказнага за прыём заяў. У выніку гэтага шмат скаргаў блоскедна стаялі.

Мэцін.

АД РЭДАКЦЫІ: Рагачоўскія **райарганізацыі не толькі марынуюць скаргі працоўных, яны не разгуюць і на 57 лістоў, дасланых «Звяздой».**

Рэдакцыя ўпэўнена, што Рагачоўскае РКК РСІ тэрмінова праверыць работу райса і іншых арганізацый і прыме належныя меры да канкрэтных вінаватых.

УДЗЕЛ РАБОТНІЦЫ І КАЛГАСНІЦЫ БССР У СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ

«Галоўнае, асноўнае ў большэвізме і ў расійскай Кастрычніцкай рэволюцыі,—ёсць учэпчанне ў палітыку імённа тых, хто больш за ўсё быў прыгнечан пры капіталізме...

А ўцягнуць у палітыку масу нельга без таго, каб не ўцягнуць у палітыку жанчын, бо жанчына палова рода чалавечага прыгнечана ўдвая». (Ленін).

Кастрычніцкая рэволюцыя з першых дзён свайго існавання змяла да канца ўсе подлыя законы **«свяшчэннай прыватнай уласнасці»**, законы пяроўнасці прыгнечанай жанчыны, спекулюючыя на яе ў шлюбе, сямейных і грамадзянскіх правах.

Але **«гэта толькі першы крок да вызвалення жанчыны,—пісаў вялікі правадыр усяго працоўнага света тав. Ленін. Для поўнага вызвалення жанчыны і для сапраўднай роўнасці яе з мужчынай трэба, каб была арганізаваная гаспадарка і быў удзел жанчыны ў агульнай вытворчай працы».** Гэтыя ўказанні сталі зараз сапраўднасцю ў выніку вялікіх перамог нашай партыі на ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва.

У выніку буйнага роста прамысловасці, бесперапынна ўзрастае колькасць работніц на прадпрыемствах і павялічваецца іх удзельная вага сярод рабочых. Толькі за апошнія два гады на прадпрыемствах БССР колькасць работніц павялічылася з 26 да 41 тысячы і ўдзельная вага іх сярод рабочых з 31 да 42,7 проц.

Гэты рост іншу не толькі па лёгкай прамысловасці, як швейная, заняпадкавая і тэкстыльная, дзе пераважную ролю адыгрывае жаночая праца, але і ў такой галіне, як металаапрацоўчая, удзельная вага жанчын павялічылася з 5,6 да 15,5 проц. У барацьбе за выкананне задач, пастаўленых партыяй на дасягненні новых прадпрыемстваў, аўладанні новай тэхнікай, работніца таксама адыгрывае вялікую ролю.

За гады рэволюцыі і соцыялістычнага будаўніцтва, пад кіраўніцтвам КП(б)Б вырас значны актыў работніц, выдучан на кіруючыя пасады—ў наркаматы, советы, саюзы: работніца **Марусевіч**—Нарком соцыяльнага забеспячэння, работніца **Русановіч** — член калегіі Наркамлегпрама, **Прусакова Каця**—намеснік Наркома РСІ і загадчык бюро скарг, старшыня **Бярзінскага РВК—Воўк Кацярына**, загадчык сектара кадраў ЦВК—тав. **Майзіт**, загадчык аддзела ЦПСЮ—**Пракоф'ева**, старшыня ЦП Саюзаў **Захарава, Багарад** і шмат іншых.

Пекальні год пасля Кастрычніцкай рэволюцыі сялянка не змагла скарыстаць поўнасцю правы, прадастаўленыя ёй совецкай уладай. Дабіцца сапраўднай роўнасці з мужчынай было цяжкавата ва ўмовах адпасобнай вёскі. Рост фактычнай роўнасці цесна звязан з перамогамі ў галіне соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Указанні генеральнага правадыра нашай партыі і кіраўніка усяго света тав. **Сталіна** аб неабходнасці рашучага вылучэння калгаснікі на кіруючую работу і большага прыцягнення іх да справы арганізацыйна-гаспадарчага і палітычнага ўмацавання калгасаў зараз пераўтвараюцца ў жыццё. Яшчэ з пачатку гэтага года па БССР налічвалася толькі адзінкі жанчын—старшыні калгасаў і брыгадзіры. За першы весняваі сяўбы і ўборачнай кампаніі ўжо вылучана на калгасную работу па поўных даных з 50 раёнаў да 100 жанчын—старшынямі калгасаў, 578 брыгадзірамі, і да 600 загадчыцамі жывёлагадоўчых калгасных таварных ферм.

Трэба адзначыць, што не ўсе яшчэ раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі ўпчыльную падышлі да справы вылучэння. Асобныя раёны, як **Мазырскі, Бярэзінскі, Крычаўскі, Тураўскі,** праяўляюць перашкоды гэтай справы. Але ў большасці раёнаў ёсць значны эр

ПРОЛЕТАРЫЯТ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІН РЫХТУЕЦЦА ДА КАСТРЫЧНІКА

ЧЭХАСЛАВАКІЯ

ПРАГА, 3 (БЕЛТА). У сувязі з надыходзячай XVI гадавінай Кастрычніцкай рэволюцыі ЦК компартыі Чэхаславакіі звяртаецца з адозвай да ўсіх працоўных, якая растлумачвае сэнэ і значэнне гэтай даты. Указаўшы, што гадавіна Кастрычніцкай рэволюцыі — сапраўднае свята працоўных Чэхаславакіі, ЦК компартыі заклікае адзначыць гадавіну выступленнямі і дэманстрацыямі. «Мы — гаворыцца ў адозве—ганарымся кожным поспехам соцбудаўніцтва ў СССР, які з'яўляецца найвялікшай апорай у барацьбе супроць капіталізма».

Рэдакцыя журнала, які— выдаецца перадавой інтэлігенцыяй «Свет совєтаў» арганізуе даклад прафесара Неедлага на тэму: «16 год совецкай культуры». «Таварыства збліжэння з СССР» налад жвае сход на тэму аб чэхаславацка-совецкіх узаемаадносінах.

ЛАТВІЯ

РЫГА, 3 (БЕЛТА). Згодна паведамлення друку, нелегальная компартыя Латвіі выпусціла адозву да рабочых з заклікам выступіць супроць ліквідацыі рабоча-сялянскай фракцыі сойма і супроць арышта членаў фракцыі. У сувязі з распаўсюджаннем адозвы праведзены масавыя арышты. Ахранка арыштоўвае рэволюцыйных рабочых таксама ў сувязі з надыходзячым святкаваннем гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі.

РУМЫНІЯ

ВЕНА, 3. (БЕЛТА). У сувязі з набліжэннем XVI гадавіны Кастрычніка ў Румыніі арыштавана многа рабочых, якія падазраваюцца ў прыналежнасці да компартыі. Згодна паведамлення ахранкі, нібыта ўдалося выявіць кіраўніцтва компартыі Румыніі і рэволюцыйнай прафапазіцыі, а таксама падпольныя друкарні. У сувязі з гэтым урад пагражае аднаўленнем адменанага толькі ў верасні г. г. асаднаго становішча.

КОНКУРС НА ЛЕПШЫ ЖАКТ

Выкараніць бюракратычныя метады работы!

Сістэма кіраўніцтва жыллёвай кааперацыяй базуецца на прыцягненні самых шырокіх працоўных мас. Гэта ўскладае на жыллёвую кааперацыю вялікую адказнасць за правільныя метады работы, за асабліва чулыя і ўважлівыя адносіны да працоўных-пайшчыкаў, за здавальненне іх культурна-бытавых патрэб.

Жыллёвая кааперацыя за апошні час мае рад дасягненняў. Конкурс на лепшы жакт паказаў, што рад праўленняў жактаў сапраўды навярнуліся тварам да ўдарніка вытворчасці, сапраўды кладуць аб палепшэнні яго кватэрных умоў, аб культурна-бытавым абслугоўванні сваіх жыхароў. Тое, што ў многіх жактах у конкурсе прымаюць удзел значныя групы жактаўскага актыва,— сведчыць аб здольнасці многіх праўленняў жактаў мабілізоўваць масы вакол задач, якія высоўваюць партыя і ўрад перад жыллёвай кааперацыяй.

Аднак, ёсць рад такіх фактаў, якія сведчаць аб наяўнасці рэштак бюракратычных, чыноўніцкіх метадаў работы.

Вось, напрыклад, **жакт № 35.** Праўленне гэтага жакта правяло рад рамонтаў. Але па лініі сувязі з масай пайшчыкаў яно не справілася. Жывое кіраўніцтва праўленне жакта замяніла голым адміністраваннем. Праўленне не здолела выразіць пытання размеркавання жыллёвай плошчы ў адрамантаваных кватэрах. Рад спраў быў перададзен у жыллёвую камеру нароўда.

У адным з дамоў гэтага жакта жыве работніца **Папко.** Жыве яна ў вельмі дрэнных умовах. Шматлікія заявы ў праўленне жакта не далі ніякіх вынікаў. Нарэшце, намеснік старшыні праўлення тав. **Конанаў** раіць ёй абмяняцца на прынцыпе добраахвотнасці з грамадзянкай **Курачкінай,** якая жыве адна ў вялікім пакоі. Абмен адбыўся, але пры гэтым не было зроблена самага «галоўнага»—абедзве жыхаркі па сваёй малапісьменнасці не напісалі заявы (!) аб гэтым у праўленне жакта. І вось старшыня праўлення **Антонік,** даведаўшыся аб гэтым, склікае фракцыю жакта і выносіць бюракратычную пастанову—«перасяліць іх у старыя пакоі». Жыхаркі вельмі здзіўлены такой пастановай і адмаўляюцца ў другі раз мяняцца кватэрамі. Тады член праўлення **Марцынкевіч,** загадчык дамамі **Бернштэйн** пачынаюць самі выкідваць іх рэчы з кватэр, потым для надання гэтаму самавольству «законнага» характара, пры садзейнасці старшыні праўлення **Антоніка** (ён-жа работнік міліцыі) выклікаецца міліцыянер, які адводзіць гр. Папко ў міліцыю.

Гэты яркі прыклад **самавольства, бюракратычна - фармальных адносін да жыхароў** знайшоў правільную ацэнку ў прыгаворы суда, якім удзельнікі гэтай «расправы» асуджаны да прымусовай працы, а матэрыял аб старшыні праўлення Антоніку накіраван у ГарКК—РСІ.

У гэтым-жа жакце мела месца другое злачынства. Загадчык дамамі **Бернштэйн** адрамантаваў пакой і сам яго заняў, не гледзячы на тое, што член жакта—работніца **Вейсберг** — каля года чакала канца рамонта гэтага пакоя.

У **жакце № 7** жыве рабочы-ўдарнік **Саколін.** Займае ён з жонкай цёмны чулан. Праўленне жакта рамантуе дом і ў працэсе рамонта ліквідуе гэты самы чулан. Саколін застаецца без кватэры. Праўленне жакта спачатку зусім адмаўляе Саколіну ў жыллёвай плошчы і раіць яму шукаць іншую кватэру. Аднак, пасля таго, як суседка Масткова згаджаецца палову свайго пакоя аддаць Саколіну, пры ўмове пабудовы перагародкі, праўленне жакта з гэтым згаджаецца. Саколін вельмі рад, просіць на сваім заводзе вызваліць яго на час рамонта ад грамадскай нагрузкі, дапамагае рабочым хутчэй скончыць перагародку, каб пакінуць «кватэру» пад адкрытым небам. Але ў гэты-ж час Саколін камандыруецца па справах завода. Праўленне жакта не спіць, яно, як быццам толькі і чакае гэтага момента і выносіць мудрую пастанову—пакой, вызначаны для Саколіна, аддаць іншай асобе. Гэта асоба ўзламвае дзверы і займае пакой Саколіна.

Нарэшце, зразумела, вырашыў справу ў карысць Саколіна. Але цікава, што праўленне жакта на чале са старшынёй **Герчыкавым** да гэтага часу не зразумела сваёй грубай памылкі і цкуе ўпаўнаважанага дома т. **Іштву** за тое, што яна на судзе расказала праўду аб гэтым факце.

Яшчэ адзін факт. Васнаслужачы **Барысевіч** яшчэ ў 1932 годзе з дазвола праўлення жакта № 52 расходаваў 100 рублёў на рамонт сваёй кватэры. Разлічыўшы ён адаў у праўленне і атрымаў дазвол у працягу паўнага часу не ўносіць за кватэру квартплаты. Праз год Барысевічу прад'явілі рахунак—уплаціць кватэрную плату за ўвесь год і не ні за гэты тэрмін. Выявілася, што бухгалтарыя ў свой час не правяла ў сябе рахунак. Справа дахадзіць да суда. Суд вырашае справу ў карысць тав. Барысевіча.

У **жакце № 51** жыве рабочы фабрыкі «Кастрычнік» т. **Фрыдман.** Кватэра т. Фрыдмана патрабуе тэрміновага рамонта. Але жакт упарта адмаўляецца і толькі суд абавязвае жакт зрабіць патрэбны рамонт.

У **жакце № 57** праўленне давяраве шавуковаму работніку Аляхновічу абмяняцца кватэрамі і ў дзень, калі Аляхновіч выязджае, у яго кватэру распаладжаннем старшыні праўлення **Баравіка** і загадчыка дамамі **Матусевіча** ўселяецца другі грамадзянін.

Такіх фактаў **бяздушна-бюракратычных** адносін да жыхароў з боку некаторых кіраўнікоў жактаў можна прывесці яшчэ шмат. Замест таго, каб заходуваць рэволюцыйную законнасць, усімі сродкамі змагацца за захаванне жыллёвай плошчы, выкарыстоўваць усе магчымасці для палепшэння кватэрных умоў членаў жактаў, паляпшэння культурна-бытавых умоў—праўленні пасобных жактаў сваімі панска-саноўнымі адносінамі да членаў жактаў зрываюць умацаванне жыллёвай кааперацыі.

Трэба пакончыць з гэтай галавацяпска - шкодлівай практыкай! У часе конкурса на лепшы жакт трэба правесці якасць работы кіраўнікоў жактаў і бязлітасна выгнаць усіх чыноўнікаў, якія ігнаруюць і злосна скажаюць дырэктывы партыі і ўрада аб палепшэнні жыллёва-бытавых умоў працоўных.

ШЭНДАРАЎ.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЯ ВЫСТАЎКА

У кастрычніцкія дні ў Менску ў доме селяніна адкрываецца РЭСПУБЛІКАНСКАЯ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЯ ВЫСТАЎКА. Мэта выстаўкі — паказаць шляхі соцыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі БССР і дасягненні калгаснай вёскі ў першым годзе другой пяцігодкі.

На выстаўцы 8 аддзелаў: паляводства, садоўніцтва і гародніцтва, жывёлагадоўлі, механізацыі сельскай гаспадаркі, культуры балот, метэрэалагічнай службы і інш.

У аддзеле паляводства Збожжатрактараэнтр паказвае дасягненні лепшых калгасаў Танежыцкай і Капыльскай МТС. У мастацкіх апісаннях, фотаздымках, дыяграмах і натуральных экспанатах паказваецца рост ураджайнасці ў калгасах і ажыццяўлен не лозунга тав. Сталіна аб калгаснай заможнасці.

Менская селекцыйная станцыя выступае з экспанатамі рада новых гатункаў збожжавых культур, а таксама безапеляцыйнага лубіну.

У гэтым-жа аддзеле будзе дан макет першага ў СССР механізаванага збожжа-элеватара, пабудаванага ў саўгасе Чачавічы (Быхаўшчына).

У жывёлагадоўчым аддзеле шматлікімі дыяграмамі, фотаздымкамі будзе паказана дынаміка роста калгаснай жывёлагадоўлі. Шырока прадстаўлен на выстаўцы лепшы ў БССР жывёлагадоўчы саўгас УВАРАВІЧЫ, а таксама КОНЯСАЎГАС № 59.

У аддзеле культуры балот адлюстроўваюцца нашы вялізарныя дасягненні ў барацьбе за асваенне балот і іх культываванне.

У спецыяльным павільёне механізацыі сельскай гаспадаркі адбіваюцца дасягненні ў галіне механізацыі працэсаў апрацоўкі глебы, сяўбы і ўборкі. У павільёне паказаны 26 складаных машын выраба совецкіх заводаў, у тым ліку збожжавы камбайн, які з поспехам пра цаваў у гэтым годзе на палях БССР, трактары ХТЗ і ЧТЗ, шыроказахватная ільнацерабілка, 24-дыскавыя сяўлкі, бульба-сажалка, бульба-капалка і бульбяны камбайн — вынаходства рабочага КАЗЛОЎСКАГА.

У бліжэйшым будучым выстаўка будзе перабасталявана ў пастаянныя агра габінеты па асобных галінах сельскай гаспадаркі пры цэнтральным Доме селяніна.

Не паслабляць тэмпаў пагрузкі і выгрузкі

Ад упаўнаркамшляху

У дні святкавання Кастрычніцкай гадавіны ўсе станцыі і вузлы работу праводзяць нармальным парадкам. Клієнтура папярэджваецца аб гэтым і абавязана пагрузку падаваемых вагонаў, выгрузку і вываз са складаў і станцый рабіць строга на нормах, устаноўленых НКШЗ. Арганізацыі і асобы, зрываючыя нармальную работу станцый чыгунак, будуць прыцягнуты да найстражэйшай адказнасці. Асноўная клієнтура, пагружаючая апал, бульбу і гародніну, павінна выдзеліць на гэтыя дні адказных асоб, якія-б назіралі за нармальным ходам работы.

Пры кіраўніцтве Упаўнаркамшляху ў дні 5, 6, 7 і 8 устанаўліваецца круглосутачнае дзяжурства (тэлефон 21-163).

Упаўнаркамшляху СССР пры СНК БССР РАСКІН.

ЗАГАД ПА ГАРНІЗОНУ ГОРАДА МЕНСКА

№ 59. гор. Менск.

3 лістапада 1933 года.

1. У дзень XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі 7-га лістапада з 11 гадзін на тэрыторыі был. с.-г. выстаўкі назначаю парад часцям Менскага гарнізона.

2. На парад часці вывесці ў складзе, згодна спіса.

3. Да месца парада часцям прыбыць і закончыць пастраенне ў 10 гадзін.

4. Парад прымае часова выконваючы абавязкі камандуючага войскамі БВА тав. ЦІМАШЭНКА ў прысутнасці ўрада БССР.

5. Камандаваць парадам буду я.

6. Пастраенне часцей для парада ўскладаю на камандзіра № дывізіі тав. ГАРАЧОВА.

7. Агульны нагляд за парадкам у часе парада і дэманстрацыі ўскладаю на каменданта горада тав. ХАРАЛЕЦ. Апошняму арганізаваць і зрабіць артсалют згодна маіх указанняў.

8. Забеспячэнне і падтрыманне парадка на месцы парада і вуліцах горада ўскладаю на РК міліцыю горада Менска. Ацапленне закончыць да 8.00

9. Гарнізоннаму доктару арганізаваць часовыя санітарныя пункты:

а) на тэрыторыі парада — 3;

б) ля пад'езда Усебеларускага стадыёна, 1.

в) ля пад'езда будынка паліклінікі — 1;

г) ля будынка № 12 па Барысаўскаму тракту — 1.

НАЧАЛЬНІК ГАРНІЗОНА Г. МЕНСКА КАМАНДЗІР-КАМІСАР №-ГА КОРПУСА ІМЯ БССР ВАЙНЕР.

АГУЛЬНЫ ПЛАН ПАРАДА І ДЭМАНСТРАЦЫІ 7 ЛІСТАПАДА 1933 ГОДА

Пачатак парада ў 11 гадз.

Пачатак дэманстрацыі пасля сканчэння парада.

Агульны нагляд і кіраўніцтва па падтрыманні парадка — камендант горада Менска тав. ХАРАЛЕЦ.

Ацапленне тэрыторыі парада, падтрыманне парадка на зборных пунктах агульных калон, па маршрутах іх спед вання да месца дэманстрацыі і ў часе дэманстрацыі — начальнік аддзела знадворнай службы Галоўнага Кіраўніцтва РК міліцыі тав. ДЭРМАН. Тэлефоны: служ. 23241 і 23351, кват. 21968.

Адказны па рэгуляванню руху калон — начальнік 1-га аддзялення РК міліцыі гор. Менска тав. ПАВОРОТНЫ. Тэлефоны: служ. 22686 і 22687, кват. 20024, дад. 80.

Праход і праезд на тэрыторыі парада для ўсіх спыняецца ў 10 гадз. 45 мін.

Запрашальныя білеты і прапускі для аўтатранспарта выдаюцца гарадской кастрычніцкай камісіяй.

МЕДЫЦЫНСКАЯ ДАПАМОГА

Адказны арганізатар — гарнізонны доктар тав. НАУМАЎ. Тэлефоны: служ. № 21445, кват. № 20774.

МЕДЫЦЫНСКІЯ ПУНКТЫ

а) на тэрыторыі парада — 3;

б) ля пад'езда Усебеларускага стадыёна, 1;

в) ля пад'езда будынка паліклінікі — 1;

г) ля пад'езда будынка № 12 па Барысаўскаму тракту — 1.

Адказны арганізатар вет. службы — гарнізонны доктар тав. БАСЯЕЎ.

Ветпункты па асобнаму ўказанню.

СУВЯЗЬ

Начальнік сувязі — ад'ютант каменданта горада тав. РОЗМАН.

Тэлефоны № 21389 і 24282. Дзяжурны — тав. ВОЎКАЎ.

КАМЕНДАНТ ГОРАДА МЕНСКА ХАРАЛЕЦ.

Паведамленні

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 10 ЛІСТАПАДА Г. Г. У СТАРОБІНЕ БУДЗЕ ПРАЦАВАЦЬ ВЫЯЗНАЯ ПАРТКАМІСІЯ ЦКК КП(б)Б па разгляду партспраў Старобінскага раёна НАСТУПНЫХ Т. Т.:

Грынфельд М. Ю., Кузыка А. М., Лучыц Ф. В., Капыноскі П. С., Врублеўскі Я. В., Герасіменя Я. І., Пушкароў М. А., Булаўкін П. К., Верасневіч В. А., Мінчук А. Н., Бегун М. П., Шустэрман Л. А., Жыткевіч І. П., Лысёнак Я. С., Канавалаў, Клезовіч В. М., Габо С. А., Сцешыў Р. П., Шаўчэнка А., Паспурэвіч Н. Я.

Яўка пералічаных таварышоў абавязкова.

Пералічаныя таварышы павінны прадставіць партакамісіі водгукі ад парт'ячэек аб сваёй апошняй рабоце.

ЦКК-НК РСІ Беларусі абавязвае ўсе гаспадарчыя ўстановы прадставіць да 10-XI—33 г. у ЦКК-НК РСІ Бел. (пакой № 12) фін.-сав. групе штаты на 1934 год, прычым папярэджвае, што штаты на 1934 г. не павінны перавышаць зацверджаных штатаў на 1933 год.

ЦКК-НК РСІ Бел.

ПК ЦКК КП(б)Б просіць т. Рыхтармана, раней працаваўшага ў Цэнтральна-чарназемнай вобласці, паведаміць ПК ЦКК (Менск, Совецкая, 55) адрас месца работы і жыхарства без высылкі ў Менск.

Просьба да ўсіх партарганізацый, ведаючых аб месцы знаходжання ўказанага таварыша, паведаміць ПК ЦКК.

ПАРТКАЛЕГІЯ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

На СССР

Падрыхтоўка да кастрычніцкіх свят

ВАРОНЕЖ, 4 (БЕЛТА). У Варонежы заканчваецца будаўніцтва першага ў Саюзе завода складаных апаратуры для чыгуначнай электрасігналізацыі і аўтаблакіроўкі. Пушчаны тры асноўных цэхі — механічны, мантажны і інструментальны. Цэхі абсталяваны імпартнымі станкамі. У 1934 годзе завод дасць прадукцыі на 4 мільёны руб. Ва ўсіх цэхах будзе занята 10 тыс. рабочых.

***

УФА, 2. (БЕЛТА). 16 гадавіну Кастрычніка Башкірыя сустракае з буйнымі перамогамі ў гаспадарчым і нацыянальна-культурным будаўніцтве. Ленінская нацыянальная палітыка партыі перафармавала гэту цёмную, неграмотную, выміраючую нацыянальнасць. Зараз у школах рэспублікі — поўмільёна вучняў, галоўным чынам, башкір. Створаны пяць ВНУ, сетка тэхнікумаў. Арганізован башкірскі тэатр. Узнікла нафтавая і харчовая прамысловасць. Працуе новая запалкавая фабрыка. Закладзен гіганцкі завод матора будаўніцтва. Гатоў да пуска дубільны, мапшынны і аўтаматны цэхі, жыва цікавячыся вытворчасцю, тэхнікай і арганізацыяй працы.

— Мы здзіўлены вашым тэхнічным ростам — заявілі англійскія дэлегаты.— Ваш завод цяпер не ўступае перадавому англійскаму прадпрыемству. Па арганізацыі працы вы апрэдзілі любое капіталістычнае прадпрыемства.

ЛЕНІНГРАД, 4. (БЕЛТА). У Ленінград на кастрычніцкія ўрачыстасці прыбыла амерыканская рабочая дэлегацыя. На Варшаўскім вакзале дэлегацыю сустрэлі прадстаўнікі гаркома УсеКП(б), Ленпрафсовета, рабочыя фабрык і заводаў.

Замежныя дэлегацыі рабочых у СССР

ЛЕНІНГРАД, 4. (БЕЛТА). Прыбыўшая на кастрычніцкія ўрачыстасці ангельская рабочая дэлегацыя наведала завод «Электрасіла». Пасля экскурсіі з дырэктарам завода і старшынёю заўкома дэлегацыя ў часе абеددзіната перапынка накіравалася ў цэхі. Турбінабудаўнікі, вышаўшы на сустрач гасцям, горача віталі ангельскіх таварышаў. З адказам выступіў ангельскі рабочы-будаўнік:

«Вашы поспехі, — сказаў ён, — гэта ганаравасова і нашы поспехі. Саюз паміж рабочымі совецкай краіны і рабочымі капіталістычных краін прыбліжае да сусветнага Кастручніка».

Ангельскія рабочыя агледзелі зварачны экстраклны завод. Уступае ў строй першая чарга электрастанцыі ў 4 тыс. квт. Разгарнулася будаўніцтва магістралі Уфа —Ішымбаева. На калгасных палях Башкірыі працуе 3200 трактараў і 860 камбайнаў.

***

МАСКВА, 4 (БЕЛТА). Пастанова ЦК УсеЛКСМ аб усесаюзным суботніку моладзі спатакана з вялікім захапленнем. Стварацца штабы кіраўніцтва суботнікам. Заключацца дагаворы з гаспадарнікамі на работу. Уся падрыхтоўка да суботніка праводзіцца пад знакам спаборніцтва раёнаў.

***

АРХАНГЕЛЬСК, 3 (БЕЛТА). У бліжэйшы час каля Архангельска пачнецца будаўніцтва магутнага суднабудаўнічага завода. Уся пабудова будзе каштаваць 32 млн. руб.

НОВАСІБІРСК, 3 (БЕЛТА). К 16-й гадавіне Кастрычніка ўступае ў спрой лесапільны цэх буйнейшай у Эўропе фабрыкі алоўкавай дошчачкі. Магутнасць фабрыкі — 7.500 тыс. просаў дошчачкі ў год.

ДЗЕРЖАЎНЫ ЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР

(вул. Валадарскага, 7, тэл. № 21-813)

Адкрыццё сезона 12, 13, 15, 16, 17, 18 лістапада

РЭКРУТ

Пастаноўка заслуж. артыста рэспублікі М. Ф. РАФАЛЬСКАГА.

Пачатак у 8 гадз. вечара.

Білеты ў касе тэатра і ў рабоч. ка е.

Прымаюцца заяўкі на культпаходы і метавыя спектаклі.

Чырвоная Зорка — Гукавы фільм Аненкоўшчына

Дзіцячы гукавы кіно-тэатр — Гукавы мастацкі фільм ЗДАНЬ, ЯНАЯ НЕ ВАРОЧАЕЦЦА

Кіно „Пролетарый" — Мастацкі совецкі фільм ТЫЯ, ЯКІЯ СТАЛІ ВІДУШЧЫМІ

Кіно Інтэрнацыянал — ПРЫГОДЫ ПАДКІДЫША 1-я СЕРЫЯ

Кіно „СПАРТАК" — З 5 лістапада выдатны фільм НЯНАВІСЦЬ драма ў 8 частках. Каса—з 4-х гадзін.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА ДЗЯРЖБАНКА

згодна пастановы СПА ад 20/IV-32 г. аб парадку рэгістрацыі неплацежаздольных і няспраўных гаспадарчых органаў

—абвяшчае—

аб неплацежаздольнасці Нараўлянскага ОРС'а лесправгаса па наступных прычынах:

1) адсутнасць сродкаў на разліковым рахунку;

2) наяўнасць неаплочаных тэрміновых пазык у 8360 р.;

3) сістэматычная неаплата рахункаў-фактур ад 10 дзён да 1½ месяца

4) парушэнне правіл па грузазвароту (продаж тавараў па неаплочаных рахунках).

УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА ДЗЯРЖБАНКА

Полацкі Будаўнічы Тэхнікум

даводзіць да ведама таварышоў падаўшых заявы на падрыхтоўчыя 3-хмесячныя курсы, што апошні тэрмін іспытаў прызначаецца на 10-XI.

Да гэтага часу патрэбна з'явіцца захапіўшы з сабой пісцельныя прылады.

Заняткі на падрыхтоўчых курсах пачнуцца 15-XI-33 г.

Дырэкцыя.

ПАСТАНОВА № 29

ПРЭЗІДЫУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

2 лістапада 1933 г. *г. Менск*

Аб рамонце турбіны „Метра-Вікерс" і кацельнай электрастанцыі, у сувязі з уступленнем у зімовы максімум

1) Лічыць неабходным вытварыць рамонт турбіны „Метра-Вікерс" і кацельных установак электрастанцыі на працягу 7, 8 і 9 лістапада, для чаго дазволіць дырэкцыі спыніць падачу электраэнергіі прадпрыемствам горада 9 лістапада.

2) Электрастанцыі аб гэтым давесці да ведама ўсіх прадпрыемстваў горада.

СТАРШЫНЯ МЕНГАРСОВЕТА КАРАНЕУСКІ

САКРАТАР МЕНГАРСОВЕТА КАПЕЛЕВІЧ

БЕЛШВЭЙТРЭСТ

Асноўныя паказальнікі работы за 9 месяцаў 1933 г.

Паказальнікі	1932 г.	За 9 мес. 1932 г.	За 9 мес. 1933 г.
Агульная колькасць прадукцыі ў тыс. руб.	162.558	125.501	98.831
Сярэдняя колькасць рабоч.	13.358	13.475	11.720
Выпрацоўка на 1 рабочага	12.169	9.313	8.432
Процант брака	7,8	—	4,7
Зарплата	1.180	800	815

Процант ахопа соцспаборніцтвам і ударніцтвам: На 1 студз. 1933 г.—63 проц. На 1 ліпеня 1933 г.—76,2 проц.

ДЫРЭКЦЫЯ

МЕНСКАЯ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ

ПАКАЗАЛЬНІКІ	Выпрацавана квт.-гадз. за 9 м. 32 г.	Выпрацавана квт.-гадз. за 9 м. 33 г.	У процантных адносінах
1. Выпрацавана электраэнергіі	19.000.000	23.500.000	124
2. Выпрацавана на ўласныя патрэбы ў проц. да выпрац.	3,5 проц.	3 проц.	85 проц.
3. Лік абанентаў	9.300	11.200	116

Дырэктар СУХАРУЧКІН.

Бухгалтар АДМОС.

ПАСТАНОВА

Менскага Гарадскога Совета Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

3 лістапада 1933 г. **г. Менск.**

Аб святкаванні XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі

У сувязі з правядзеннем святкавання XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі Менскі Гарадскі Совет ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў, грамадскіх і прафесіянальных арганізацый, ЖАКТ'ы, жылтрэст і прыватных домаўласнікаў да 6 лістапада 1933 г. да 16 гадзін упрыгожыць займаемыя імі дамаўладанні сцягамі, лозунгамі, плакатамі і ілюмінаваць іх.

2. Пад адказнасць праўленняў жактаў, загадчыкаў дамамі, кіраўнікоў грамадскіх, прафесіяльных арганізацый і ўстаноў 5 лістапада да 16 гадзін скончыць поўную ачыстку домаўладанняў, двароў, вуліц і тратуараў.

3. Абавязаць загадчыкаў магазінаў і дырэктароў прадпрыемстваў, якім прадстаўлены вітрыны для выставак, скончыць упрыгожванне апошніх 5-га лістапада да 19 гадзін.

4. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскладаецца на РС міліцыю.

Старшыня Менскага Гарадскога Совета КАРАНЕУСКІ

Сакратар Менгарсовета КАПЕЛЕВІЧ

СТАРА-БАРЫСАЎСКІ СЕІНАГАДОЎЧЫ ТЭХНІКУМ з 15 лістапада 1933 г. абвяшчае студзеньскі прыём

на першы курс тэхнікума ў колькасці 60 асоб. Заявы і дакументы прымаюцца да 20 снежня 1933 года. Заняткі пачынаюцца з 1 студзеня 1934 года. Для паступлення ў тэхнікум патрэбны наст. дакументы: 1) анкета, засведчаная сельсавета ці арганізацыі; 2) даведка аб сацыяльным маемасным становішчы; 3) даведка аб карыстанні правам голаса, 4) метрычная выпіска і 5) даведка аб стане здароўя. Першыя тры месяцы студэнт першага курса атрымлівае дапамогу ў памеры да 30 руб., а потым залічваецца на стыпендыю, якая выдаецца ад 40 да 60 руб. у мес. Студэнты забяспечваюцца інтэрнатам, пасцельнай прыладай. Пры тэхнікуме ёсць свая сталовая, лазня і пральня, а таксама вучэбныя прылады і гд.

Заявы падаваць на адрасу: Стара-Барысаў, Барысаўскага раёна, сеінагадоўчы тэхнікум.

Дырэкцыя.

МЕНСКАЯ ШКОЛА ФЗВ КАМУНАЛЬНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ пры ВК камунальнай гаспадаркі АБВЯШЧАЕ НАБОР ВУЧНЯЎ у такарны і слесарны цэхі

Прынятыя забяспечваюцца зарплатай ад 30 да 60 рубл. і інтэрнатам. Прымаюцца скончышыя самігодку ва ўзросце ад 15 да 19 год.

Дакументы, згодна даведніка прыема ў навучальныя установы, дасылаюцца **да 15 лістапада** па адрасу:

Менск, Нова-Маскоўская 176 Дырэкцыя

Гіпрадору пры Галоўдартрансе патрэбны глебоведы і геолагі

для работы па гл ебавых і геалагічных вышуках. Аплата згодна існуючых ставак.

З прапановамі звяртацца: Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх.

РАДЫЁАДДЗЕЛ БЕЛАРУСКАГА КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ

паведамляе, што, згодна пастановы наркамата сувязі СССР ад 19-IX 1933 г № НР-689 (у адпаведнасці з пастановай ЦВК СССР ад 16-IX-32 г. № 1433), з 1-га кастрычніка 1933 г. **уводзяцца плата за карыстанне радыёперадатчыкамі** на ўсёй тэрыторыі СССР, ад якой ослабляюцца толькі радыёстанцыі Наркамсувязі, АДПУ і Наркамваенмора.

На падставе вышэйпаказанай пастановы **абавязкова** **перарэгістрацыя** ўсіх без выключэння радыётэлеграфных. радыётэлефонных і радыёпрыёмальных установак па БССР **у наступныя тэрміны:**

1. Радыёстанцыі ТПР, калектыўныя і індывідуальныя,—з 1 па 30 лістапада г. г.

2. Радыёстанцыі Наркамсувязі, і КПС, Наркамвода і Аэрафлота (уключаючы самалётныя і на дырыжаблях) і радыёстанцыі астатніх ведамстваў і арганізацый размешчаныя на тэрыторыі ў эўрапейскай частцы СССР, уключаючы Уральскую вобласць і Закаўказ'е—з 1 па 31 снежня г. г.

3. Радыёстанцыі астатніх вобласцей, краёў і рэспублік СССР— з 1 студзеня па 31 студзеня 1934 г.

Перарэгістрацыя праводзіцца згодна спэцыяльнай інструкцыі № 705 ад 23-IX г.г., выданай наркаматам сувязі ў адмену ранейшага парадка рэгістрацыі, згодна інструкцыіад 29-I 1932 г.

Падрабязны тэкст інструкцыі НК сувязі № 705 аб перарэгістрацыі, пастанова Наркамсувязі № НР-689 аб увядзенні платы і пастанова НК сувязі № НР-650 ад 19-IX 1933 г. аб увядзенні сістэмы штрафаў за парушэнне правіл экспляатацыі радыёстанцыі апублікаваны ў асобнай брошуры, якая выпускаецца з друку міжведамственным камітэтам радыёсувязі і якую, як і ўсе даведкі па гэтай аб'яве, можна атрымаць у радыёаддзеле Беларускага Кіраўніцтва Сувязі (гор. Менск. Універсітэцкая 16) і у раёнах БССР—у райаддзелах сувязі.

Радыёаддзел Беларускага Кіраўніцтва Сувязі

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК

ВЫДАВЕЦТВА

Выданні, якія выйшлі з друку ў 1933 годзе

НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ:

АФАНАС'ЕЎ (акад.) — Да пытання класіфікацыі падзолістых, балотных і лугавых глеб БССР. Цана 75 к.

АФАНАСЕЎ (акад.). — Як павысіць ураджайнасць на глебах БССР. Цана 45 к.

АФАНАС'ЕЎ (акад.) — Глебавы пакроў Аршаншчыны і Магілеўшчыны. Цана 1 р. 50 к.

БАЎЭР і інш. — Жыццё. Цана 40 к.

ВАХЦЕЕЎ (праф.) — Шырокі скарыстаем торф на агародах. Цана 45 к.

БАШКО (праф.) — Ад Балтыцкага да Чорнага мора. Цана 1 р.

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК у барацьбе за ўздым ураджайнасці. Цана 2 руб.

БРЫХНІЧОЎ — Джэмс Уатт — вынаходца паравой машыны. Цана 85 к.

БУЛГАКОЎ — Як праводзіць палявыя доследы ў калгасах і саўгасах Цана 50 к.

БУРСТЫН (акад.) — Да характарыстыкі роўніцы шаравых і цыліндрычных паверхняў. Цана 1 руб.

БУРСТЫН (акад.) — Фізычныя метады матэматыкі. Цана 75 к.

ВАСІЛЬЕЎ — Шкодзікі буракоў і лубіну. Цана 80 к.

ВОЎЛЫ (акад.) — Праблема Вялікага Дняпра. Цана 60 к.

ГАЎЗЕ — Да тэорыі гаспадарчага разліку. Ц. 50 к.

ГЕЛЛЕР — Аб лёгачных і цяглічных гельмінтозах. Цана 85 к.

ГІНЗБУРГ — Скарыстанне торфа ў соцыялістычнай сельскай гаспадарцы. Цана 35 к.

ДАРОЖКІН і РАЎДО — Параённая характарыстыка захворвання бульбы ў БССР. Цана 2 р. 50 к.

ДЗЕЙНАСЦЬ мінеральных угнаенняў на ўраджай бульбы і некаторых іншых культур на глебах цэнтральнай і паўднёвай часткі БССР. Цана 1 руб.

ЗАЛЕЎСКІ — Бібліяграфія літаратуры аб Полышчы, Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі, выданай у СССР у 1930 г. Цана 75 к.

ЗАПІСКІ інстытута Літаратуры і Мастацтва, кніга 1-я. Цана 1 р. 50 к.

ЗБОРНІК прац Біялагічнага інстытута, ч. 1-я. Цана 1 р. 75 к.

ЗБОРНІК прац Біялагічнага інстытута, ч. III-я. Цана 1 руб.

ЗБОРНІК прац Псіха-Неўралагічнага інстытута. Цана 1 р. 50 к.

ЗБОРНІК праграм і інструкцый па краязнаўству. Вып. II. Цана 75 к.

ДОЎГІ — Нацыянал-фашызм у Латвіі. Цана 75 к.

КАВАЛЕЎ — Аб геалагічнай пабудове БССР. Цана 20 к.

КАНАПЛІН — Аб класавым змесце Парыжскай Камуны і Светаў. Ц. 65 к.

КАНАПЛІН і РУДЗІЦКІ — Сістэма совецкага прадстаўніцтва. Ц. 85 к.

КРУКОЎСКІ — Як даследаваць карысныя выкапні. Ц. 75 к.

КУЧЫНСКІ — Глебавы нарыс б. Барысаўскай акругі. Ц. 1 р 20 к.

ЛІБКНЕХТ В. — Жыццё і дзейнасць Карла Маркса. Ц. 75 к.

ЛАФАРГ Поль — Успаміны аб Карле Марксе. Ц. 50 к.

ЛЯЎДАНСКІ — Да гісторыі жалезнага прамысла на Палессі. Ц. 1 р. 10 к.

МІХАЙЛОЎСКАЯ — Пустазелле і шкодныя расліны нашых палёў і нашаў. Ц. 50 к.

МАЕЎСКІ — Фасфарыты БССР. Цана 60 кап.

МАКСІМАЎ А. — Ленін і прырода знаўства.